Лабараторыя
мастацкага і навуковага
перакладу

СЯРЭДНЯЯ ЭЎРОПА

# ЭЎРАПЕЙСКІ ЛЯТУЦЕННІК



Тадэвуш Ружэвіч

# БЕЗ

Выбраныя вершы

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2012

УДК 821.162.1-1
ББК 84(4Пол)-5
Р 83

Пераклад *Марыны Казлоўскай*

Copyright do tekstów oryginalnych © Tadeusz Różewicz.
© Wydanie w języku białoruskim, Tadeusz Różewicz. Utwory zebrane. Poezja. East European Democracy Centre, 2011

This publication has been funded by the Polish Book Institute – the ©POLAND Translation Program.

Пераклады зроблены паводле выданняў:

Tadeusz Różewicz. Utwory zebrane. Poezja. T. 1-4. Wrocław: Wydawnictwo Dolnośląskie, 2006.
Tadeusz Różewicz. Szara strefa. Wrocław: Wydawnictwo Dolnośląskie, 2003.
Tadeusz Różewicz. Wyjście. Wrocław: Wydawnictwo Dolnośląskie, 2004.
Tadeusz Różewicz. Kup kota w worku. Wrocław: Biuro literackie, 2008.

**ISBN 978-985-6992-20-2**

©Tadeusz Różewicz, 1947–2008.
©Казлоўская М., пераклад на беларускую мову, 2012.
©Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2012.

# АЦАЛЕЛЫ: ТАДЭВУШ РУЖЭВІЧ

*Пані прафесар Агнешцы Чайкоўскай з удзячнасцю*

Ён стары, ён нават вельмі стары чалавек. І ніякая кніга не дасць вам таго, што на ўласныя вочы бачыў ён…

Яго ахрысцілі ў гонар Касцюшкі. Януш любіў Касцюшку. Старэйшы брат, які аднойчы стаў маладзейшым на жыццё. Вялікі суразмоўца, чыё імя развеяў вецер. Родны. Мёртвы.

Тадэвуш Ружэвіч – прадстаўнік пакалення «спраўджанага апакаліпсісу». Пакалення падманутых, чыё юнацтва захлынулася ў моры слёз і крыві. Пакалення пасланых на бойню – ахвяраў і катаў адначасова. Пакалення ацалелых, што выжылі, загледзеўшыся ў вачніцы вайны. Новага страчанага пакалення, абцяжаранага невылечным комплексам віны перад ціхімі ўсмешкамі мёртвых, якія ніколі не даруюць: усё жыццё будуць прыходзіць ценямі ў снах, каб судзіць жывых. Бо ты – іх апошні прытулак, ты – іх вечнае жыццё.

Ён пакутліва перажывае сваю бяздомнасць, пакінутасць на папялішчы раскіданага гнязда, у свеце *без*. Без Бога, без веры, без надзеі. У свеце любові, якую перамагла смерць, дзе самотны, разгублены, расчараваны, чужы сабе і іншым чалавек апантана паўтарае сваё «не веру»: не веру ў ператварэнне вады ў віно, не веру ў грахоў дараванне, не веру ва ўваскрэсенне цела, не веру ў скрываўленага безабароннага бога, які не смяецца, ва ўсёмагутнага бога, што вісіць на сцяне нямоглы і кепска намаляваны і сыходзіць крывёй людзей, не ўласнай.

Тадэвуш Ружэвіч – прадстаўнік пакалення Калумбаў, якому пасля канца свету, пасля смерці давялося наноў аддзяляць святло ад цемры, называць прадметы і паняцці, будаваць сябе, жыццё, людзей, звяроў, краявіды.

Ён – чалавек, створаны паводле вобраза і падабенства бога, які сышоў, – наноў вучыцца бачыць, чуць і гаварыць, упарта, нібы першакласнік, паўтараючы «чалавека трэба любіць, жыццё чалавека важнае, жыццё чалавека мае вялікую вагу».

Хворы на страхі жыцця, ён крычыць шэптам «я ёсць» і тут

жа задаецца пытаннем «хто я?». Праз паўстагоддзя сумненняў і пошукаў Тадэвуш Ружэвіч здолее адказаць: «Я прайшоў пехатою краіну паэзіі, бачыў яе вокам рыбы, крата, птушкі, дзіцяці, мужчыны і старога, таму так нялёгка вымавіць гэтыя два словы *я паэт*».

Ён стварае антыпаэзію. Паэзія як мастацтва дзівосных параўнанняў і метафар, перыфраз і гіпербал засталася ў мінулым. Прыгожыя словы «чалавек і звер, любоў і нянавісць, вораг і сябра, цемра й святло» страцілі сэнс пасля Асвенціма.

У свеце, дзе перамагае Нішто, усюдыісны нябыт, паэзія становіцца барацьбой за дыханне і адначасова самазабойствам. Яна – адкрытая рана, апошняе кровапраліцце. Надта рацыяналістычная, аскетычная, канкрэтная, нават бедная для аматараў чыстай красы, паэзія Тадэвуша Ружэвіча «нічога не тлумачыць, нічога не даказвае, нічога не выракаецца, не ўяўляе сабой цэлага, не пакідае надзеі».

Паэт – толькі блазан без караля, нямы і збянтэжаны сведка эпохі, які робіць злепак са свету, фіксуе штодзённасць, такім чынам баронячы сусвет ад знікнення.

За вонкавай прастатой вершаў Тадэвуша Ружэвіча заўсёды адкрываецца падводная плынь, размова пра сутнаснае, быццёвае.

Пра новага чалавека-пакутніка, які ўсведамляе сваю самоту.

Пра наймарнейшую марнасць чалавечых намаганняў спазнаць, патлумачыць, запоўніць сусвет, загаіць раны, уваскрэсіць мёртвых.

Пра жыццё – дасканалае кола, у якім усё паўтараецца: «кожны раз пад руінамі дамоў, бальніц, храмаў памірае чалавек і Бог, памірае чалавек і надзея, чалавек і любоў». Пра жыццё – замкнёнае кола, дзе мінулае зноў пачынаецца. Крэйдавае кола, з якога ёсць толькі адно выйсце. Там мінулае ўрэшце скончыцца.

*Марына Казлоўская*

# З КНІГІ «НЕСПАКОЙ»
# 1947

## Маска

Гляджу фільм пра карнавал у Венецыі
там вялізныя лялькі
з бязгучнымі ўсмешкамі да вушэй
і панна занадта прыгожая для мяне
жыхара малога паўночнага горада
едзе раскінуўшы ногі на іхтыязаўры.

У выкапняў у маім краі галовы малыя і чорныя
ў іх забітыя гіпсам жахлівыя ўсмешкі
аднак і ў нас віруе стракатая карусель
і дзяўчына ў чорных панчохах вабіць
слана двух блакітных ільвоў з чырвонымі языкамі
і на ляту ловіць шлюбны пярсцёнак.

Нашы целы свавольныя і не любяць жалобы
а паднябенні смакуюць каханне
папраў папяровыя стужкі й вянкі
нахіліся вось так: бядро да бядра
твае бёдры жывыя
ўцякайма ўцякайма.

*1946*

## Крошка

Я хачу ёй сказаць
што наша каханне
такое маленькае
як гняздзечка
ўсланае пухам
і піскам.

Яна звіла яго на вулкане.

Яе валасы зіхацяць
нібы пёркі святла
шчасце кожная крошка якога
наталяе галодных.

Я глытальнік агню
з пажару
чарнатой патрэсканых вуснаў
хачу ёй сказаць

А яна трымае ў далоні
ўсяго адну крошку
зберагла яе вынесла
бегучы
праз агонь і ваду.

## Плач

Звяртаюся да вас святары
настаўнікі суддзі артысты
шаўцы дактары рэферэнты
і да цябе мой ойча
Выслухайце мяне

Я не малады
няхай вас не падманвае
зграбнасць майго цела
чуллівая бель шыі
яснасць адкрытага лба
пух над салодкімі вуснамі
херувімскі смех
мяккі крок

Я не малады
няхай вас не ўзрушвае
мая нявіннасць
мая чысціня
мая слабасць
кволасць і прастата

мне дваццаць гадоў
я забойца
я прылада
сляпая як меч
у руцэ ката
я забіў чалавека

Скалечаны я не бачыў
ні неба ні ружы
птушкі гнязда дрэва
святога Францыска
Ахіла і Гектара

Шэсць гадоў
з ноздраў валіла пара крыві
Не веру ў ператварэнне вады ў віно
не веру ў грахоў дараванне
не веру ва ўваскрэсенне цела.

## Маці павешаных

Трэцца аб шорсткую скуру натоўпу.

Тут
па вуліцы ходзіць
маці павешаных
чорная
срэбную галаву нясе
ў далонях
ах якая цяжкая яна
поўная ночы
разарваная святлом

звар’яцеўшы круціцца
і спявае

у ботах з крывым абцасам
з бясплодным ўлоннем
звялымі грудзьмі
звар’яцеўшы вые
на распухлы месяц

алавянымі ступнямі крочыць
па бетоне вуліц
маці павешаных
з вяроўкай на шыі
ідзе на дно.

# Доля

*Памяці капрала «Зграбнага»*

Ляжаў голы партызан
спявалі птушкі
мурашкі вандравалі
па васковых далонях

жандары пад пагрозай
забаранілі хаваць
няхай гніе вось так
падла бандыта

а родная зямля
падатная ўзрушаная
прытуліла ясную галаву
прыхінула

ляжаў пры лесе ціха
нібы піў з крынічкі ваду
схіліўшыся над
сваёй доляй
долам.

## Два прысуды

Бачу ўсмешку
знятую з яго збялелага твару
пры муры.

Вястун смерці Незнаёмы
схіліў галаву
ніжэй.

Бачу
смешны стод болю
у стаптаных пантофлях
пры кухні
малую крывую
фігурку
скамянелай маці.

## Да мёртвага

Мае справы – гэта справы жывых.

Бачу чую дакранаюся
ўзважваюся на вулічных вагах
ухінаюся ад блакітнага трамвая
ў ліпені выціраю пот з блішчастага лба
п'ю ваду з малінавым сіропам
стамляюся
тужу пішу вершы
разважаю пра смерць
купляю абаранкі і пушыстыя
як ружовыя мышы персікі
чытаю Маркса
не разумею Бэргсона
Іду на танцы з рыжай
смяёмся
з атамнай бомбы
вуснаў чырвонае кола
доўгая залатая саломінка
мая дзяўчына ў зялёнай блузцы
выпіла з неба месяц
афіцыянт разносіць белую пену піва
агеньчыкі мружацца пад вейкамі вечара
рукою яна накрыла мой неспакой
памяць пра Цябе.

Вось мае справы. Жыву
І няма для мяне нічога далей
за цябе мой мёртвы Сябра.

## Ацалелы

Мне дваццаць чатыры гады
я ацалеў
пасланы на бойню.

Якія пустыя адназначныя словы:
чалавек і звер
любоў і нянавісць
вораг і сябра
цемра й святло.

Чалавека забіваюць гэтак жа як жывёлу
я бачыў:
фургоны пасечаных целаў
людзей што не будуць збавёныя.

Паняцці ўсяго толькі словы:
чысціня і аблуда
праўда і мана
краса і брыдота
смеласць і баязлівасць.

Чысціня і аблуда важаць аднолькава
я бачыў:
чалавека які адначасна
быў дабрачынны і грэшны.

Шукаю настаўніка майстра
няхай верне мне зрок слых і мову
яшчэ раз назаве прадметы й паняцці
аддзеліць святло ад цемры.

Мне дваццаць чатыры гады
я ацалеў
пасланы на бойню.

## Называю маўчаннем

Неназванае магу назваць словам
магу назваць айчынай
каханнем золатам ружай
магу крычаць ці маўчаць
магу пералічваць колеры
моры выспы птушак плады.
Называю імя каханай
айчыну заву па імені
адно слова паўтараю двойчы
неназванае называю маўчаннем.

## 1939 год

Я падмануты таму можаце
ўручыць мне белы посах сляпога
бо ненавіджу
вас
ўцякаю
ад сябе ўчарашняга

шукаю могілкі
дзе не ўваскрэсну з мёртвых
тут пакіну непатрэбныя смешныя рэквізіты

Бога маленькага – ліпавую фігурку
арла белага – птушку
на галінцы
чалавека якім я не буду.

## Гнаны

Ноч
усмоктвае мяне
ў глыбіню
Плыву ў далонях як у ладдзі
адгэтуль адплываю.

Схаваны
голы
выкінуты
на паверхню
на небяспечную зямлю.

Твар прыклееены да шыбы
як ліст

Вось крокі
званок
звычайная размова
я кідаюся з кута у кут
крычу шэптам:
я ёсць.

## Вучань чарнакніжніка

Нашто я расплюшчыў вочы
Мяне залівае свет формаў і колераў
хваля за хваляй
форма за формай
колер за колерам
стаўшы здабычай
ядавітай зелені
халодных блакітаў
яркіх жоўтых сонцаў
яскравых чырвоных амараў
я не насыціўся.

Нашто я адкрыў вушы
мяне напоўнілі галасы жывых
рэха галасоў мёртвых
нават сляза дзярэ са скрыпам твар
як дыямэнт шкло
і цішыня нацягнутая быццам скура
ваенных барабанаў грыміць
няшчасны я чую як расце трава.

Нашто я развязаў язык
і страціў золата маўчання
пустаслоў я не скажу нічога новага
пад сонцам.

Наскрозь адкрыты
я не ведаю замовы
я не замкнуся
сам сабою.

## Жывыя памiралi

Замураваныя жывыя памiралi
чорныя мухi адкладалi яйкi
у чалавечым мясе.
З дня ў дзень
завулкi брукавалi
распухлымi галовамi.

Айцец Арон
меў бараду з моху i цвiлi
а голаў з белага святла
трымцеючы яно згасала
да скону еў з далонi
ссохлымi губамi
i расплюшчваў валошкавыя вочы.

У маленькiм памяшканнi
пухлi целы.

Саламея прадавала яблыкi
срэбныя з водарам саду
пры самай браме
што была з блакiту.

Мiж мармытання
i рудой макроты
памiж лiшайных сцен
i трупа мiнака
са скамянелым вокам
сярод камення
i выцця вар'яткi
у чырвонай суквi стаяла Саламея
а колеры ўцягвалi атруту
i яблык гнiў у далонях.

Ніхто больш яблыкаў у гета не насіў
ніхто больш яблыкаў у гета не купляў.
З дня ў дзень
спадалі целы ў дол.

## З дому майго

З дому майго
камень на камені
кветка на шпалерах
птушка і галінка

Парог які аддзяляе пустэчу ад руінаў
на парозе падкова

таго шчасця не пераступіць мне
цяпер і навекі

сцены адкрытыя
як бакі свету

у адным баку вецер
што развеяў дым і бацьку

у другім баку вецер
што развеяў дым і маці

у трэцім баку вецер
што развеяў нават імя брата

## Развітанне

Яна думала
што свет смутны
навокал
што смутныя кветкі і дождж
што смутак завёўся
ў шорсткай воўне
з водарам рэзеды
што смутныя галасы
тых хто ад’язджае
што смутна хвошча пугай
вясёлы рамізнік
яна думала
неба й зямля
смуткуюць бязмерна
а
гэта круціліся колы
ўсё хутчэй і далей.

Шырока бязмежна.

## Дасканалая

Твае гарачыя вусны
нібы блакітная зорка
ледзяная й далёкая

вочы твае
ў аправе краявіду
чыстыя да дна і халодныя
вядуць між сабой дыялог
дасканалы няспынны

з рукі што забіла мяне
абыякавасцю
ты корміш звяроў і птушак.

## З нататак

Столь:
плоскі і белы анёл
склаў крылы

У акне:
зялёныя чэлесы кактусаў
агаліліся.

Ксёндз:
трыццаць тры гузікі
зашпіленыя; апошні – вочка тлушчу
ў нябеснай поліўцы.

Ціша: плюшавы лакаматыў.

Лакаматыў: чорны насарог
які хрумстае дыяменты.

Ноч: адкрытыя вусны.

Прастытутка: у ночы нарумяненае
нутро.

Сонца: у стэнаграфістак ёсць ногі
і грудзі.

Каханне: слізкія скручаныя шаўкі.

# Яблык

Дай мне яблык
сказаў муж
і працягнуў руку

з глінянай місачкі
ссаў малако
лагодны свойскі вуж
чорны з аранжавай
бліскавіцай

у калысцы малы чалавечак
смактаў вялікі палец нагі
большай
за кветку «пантофелькі»

Павук сплёў
стрэлкі гадзінніка
якія паказвалі вечнасць
шчаслівым

а калі парвалася слабая нітка
жонка яблык чырвоны
мужу дала
і ціха
села на ганку
роднага гнязда.

## Калі ты сыходзіш

На світанні калі ты сыходзіш
твае абрысы вылузаныя з ночы
быццам светлая скрыпка
бёдры бярозавыя
выгнутыя
пругкія струны
яшчэ дрыжаць.

Укрыты атулены
тваім дотыкам
салодкім покрывам
з пяшчоты
я не засну.

Расплюшчаныя шырэй павекі
дзень напаўняе
белы быццам бялок вока
і чысты.

## Жывая зорка

Што за дні мяне атуляюць
мяккія духмяныя
як бароды купцоў асірыйскіх
столькі дзён столькі дзён
цудоўна прадуманых

што за ночы мяне паглынаюць
цёмныя як стрававальны тракт
вымашчаны чырванню слізістай
столькі начэй столькі начэй
у чэраве кіта

Прыйшоў мой сябра
з дзіркаю ў ілбе
і адарваў бароды цудоўныя
распароў кітовае чэрава
выцягнуў з мяне
гнуткі пазваночнік земнаводнага
і прышчапіў новы белы асот
як зорку з жывога срэбра.

# З КНІГІ «ЧЫРВОНАЯ РУКАВІЧКА» 1948

## Бачу вар’ятаў

Бачу вар’ятаў якія
хадзілі па моры
верылі да канца
і пайшлі на дно

усё яшчэ разгойдваюць
мой хісткі човен

адштурхоўваю іх скарчанелыя
рукі бязлітасна жывы

адштурхоўваю год за годам

## Адведзіны

Я не пазнаў яе
калі сюды ўвайшоў
добра што гэтыя кветкі
можна так доўга ставіць
у вазу

«Не глядзі на мяне так»
сказала яна
гладжу шурпатай далонню
падстрыжаныя валасы
«мне абрэзалі валасы – кажа –
паглядзі што са мною зрабілі»

зноў пачынае біцца
крынічка блакіту пад
празрыстаю скураю шыі
як заўсёды калі глытаеш слёзы

чаму яна так глядзіць думаю я
ну я мушу ісці
кажу трошкі загучна

і выходжу з клубком у горле.

## Каштан

Найтужлівей ехаць
з дому асеннім ранкам
без надзеі што вернешся хутка

Каштан перад домам пасаджаны
бацькам расце на вачах

мама маленькая
і можна яе насіць на руках

слоікі з сочывам
на паліцы
як багіні з салодкімі вуснамі
што захоўваюць смак
вечнае маладосці

войску ў куце шуфляды ўжо
да канца свету суджана быць алавяным

а Бог усёмагутны які дадаваў
горыч да слодычы
вісіць на сцяне нямоглы
і кепска намаляваны

Дзяцінства як выцерты твар
на залатой манеце якая чыста
звініць.

## Чужаніца

Дождж самотны

пасля гэтай вайны
так з усім
водгалас поўны асколкаў.

Маці ад якой
я быў адцяты
пасля нараджэння
зараз як камень.

Я выйшаў з яе
гэта яна – чужая жанчына
нясе ўбогі пучок морквы
вось так мы і ходзім
кожны ў свой бок.

Мае вочы поўныя слёз
мае вусны скрывіліся
на людзей я гляджу здалёк

не магу ўзняцца
з зямлі да неба

дождж самотны і чысты
праходзіць і ўзносіцца ўгору.

## Вяртанне

Акно адчыніцца раптам
і мама мяне пакліча
ўжо час вяртацца

расступяцца сцены
ўзыду на нябёсы ў брудным абутку

сяду за стол і неахвотна
буду адказваць на ўсе пытанні

са мной усё нармальна пакіньце
мяне ў спакоі. Галаву схаваўшы ў руках
так сяджу і сяджу. Як я ім
раскажу пра свой доўгі
заблытаны шлях.

Тут на нябёсах мамы вяжуць
зялёныя шалікі на прутках

гудуць мухі

бацька дрэмле на печцы
пасля шасцідзённай працы

Не – як жа магу я ім расказаць
што чалавек чалавека
бярэ за горла.

## Курган

Насыпалі над ім курган
з прыездаў і ад’ездаў
з часу і прасторы
з людзей рэчаў падзеяў
масла кавы газетаў
з зялёных плюшавых альбомаў
брому кветак
штучнага смеху

Амаль што ўсе прыехалі
на стале ляжыць медны ліст
сюды высыпаюць попел

Маці разграбае курган
знаходзіць галаву маладую
прамяністую
з шырокімі вуснамі
якія пахнуць тытунём

гэта Ён
каго не бягуць сустракаць
каля дома
хто не заснуў у малінніку
хто не прыедзе заўтра

Маці жывой пахаваная
ў паветры побач стала
млява рухае
пальцамі.

## Фенікс

Кроў сцякла з аблічча зямлі.
Агні як залатыя пчолы
агні як ружовыя целы
агні знікаюць з той зоркі.

Маркотныя вусны дажджу
папялястыя рэчы ў пакоі
прагная пчала тваіх вуснаў.

Мая зараніца ўдыхае
ў жменю попелу іскру жывую.
Фенікс шукае пёрка.

## Дрэва з жалю

Яно расце цэлы дзень
дрэва з жалю
дрэва з дажджу
туману слоў маўчання

ў стальное рабро моста
ўдарыў
хуткі цягнік

У нішы што інжынер
пакінуў для бедных
чакаю свайго зыходу

мой жаль узлятае і падае
адна сляза растварыла
ўвесь свет з жалеза
бетону і золата

Ты – вось карона
дрэва якое расце
ўва мне з ранку
да ночы.

## Пакінутае гняздо

Вось пакінутае гняздо
ў якое вернецца птушка

Дрэва чакае лісця
што адляцеўшы
спаліла паветра

І толькі ты далёка
пакінула мяне
каб болей не вярнуцца
ў месца
дзе памерла.

## Быў

Твая ўсмешка настолькі далёкая
як Імперыя Рымская
пра якую вучаць хлопцы
з блакітным шчытам.

Я не здольны выклікаць
тваёй добрай усмешкі
схілены нада мной
старэйшы Браце

старэйшы на трохгадовую
маладзенькую смерць

я кажу пра Цябе быў
як пра постаць пячорнага
чалавека.

## Яткі

Ружовыя ідэалы разабраныя
вісяць у ятках

У крамах прадаюцца
маскі блазнаў
стракатыя пасмяротныя
знятыя з нашых твараў
а мы жывём
мы выжылі
загледзеўшыся
ў вачніцы вайны.

## Неба дзяцінства

Неба
о салодкае паднябенне
смак міндалю мёду
маку і ванілі.

Я каму далі спазнаць
смак крыві гвалту агню
расціраю па паднябенні аплатку
крохкага анёлка
са счэзлым белым тварам.

## Калі хто пабачыць...

Калі хто пабачыць маю маму
ў сінім халаце ў белым шпіталі
якая дрыжыць
якая дубее
з драўлянай ўсмешкай
з белымі дзяснамі

Якая верыла пяцьдзясят гадоў
а цяпер плача і кажа:
«не ведаю… я не ведаю…»

яе твар як вялікая мутная сляза
жоўтыя рукі складае як спалоханая
дзяўчынка
вусны ў яе цёмна-сінія

калі хто пабачыць маю маму
зацкаванага звярка
з утаропленымі вачыма

той

ах я хацеў бы насіць яе пры сэрцы
і карміць салодкім.

# Ад маіх ног

Блакітны мячык
з дзяцінства
коціцца
ад маіх ног
далей

няўлоўны
дарма яго даганяю
цягнучы хцівыя рукі

уцякае ціха
з вока маці
схіленай над

коціцца нібы смех
жамчужны
жамчужынка за жамчужынкай

жанглёр заманіў яго
ў рукі

ах як лёгка
і бесклапотна
маім шчасцем
пацяшае людзей
чужы чалавек.

# Крыўда

I

Ты вярнулася да мяне

пасялілася
паглынаеш сон і яву
расцеш у маім жыцці

на людзей гляджу як
на тулава без галавы

калі ты мяне не пакінеш
я загіну.

II

Я не сышоў ад Цябе
нельга параніць святло
нельга параніць ваду
нельга пакрыўдзіць
паветра якім дыхаеш
але навошта
святло вада і паветра
мёртваму.

## Як добра

Як добра Магу збіраць
ягады ў лесе
я думаў
няма лесу і ягад.

Як добра Магу ляжаць
у цені дрэва
я думаў дрэвы
ўжо не маюць ценю.

Як добра Я з табою
так маё сэрца б’ецца
я думаў чалавек
не мае сэрца.

# З КНІГІ «УСМЕШКІ»
# 1945 – 2000

## Цяпло

Рукі можна сагрэць
і аб кубачак
з гарачай кавай

калі на свеце
ўжо так холадна
так холадна глядзяць
людзі
нават
немаўляты

абудзіўшыся
гавораць іржавым жалезным голасам
шыпяць і бразгочуць

## Колер вачэй і пытанні

Ці ў маёй каханай
васільковыя вочы
са срэбнай стружкай
Не

Ці ў маёй мілай
карыя вочы
з залатой іскрай
Не

Ці ў маёй каханай
чорныя вочы
без сонца
Не

Вочы маёй мілай
атуляюць мяне
восеньскім
шэрым дажджом

*1954*

## Шнур

Цягнік імкліва сек
адкройваў краявід за краявідам

Не дыхаючы набліжалася
зорка вуснаў
адкрытая
да дна
да чорнага неба
да паднябення ночы
да языка агню

Вось і я вось і я вось і я вось і я

У мяне на шыі вяртанне
сплеценае з мілоснай тугі
Ашыйнік цнотаў
калі б ён парваўся калі б упаў

Лячу ў пустату

О добры Кахання
шар пад нагамі

маці-зямля
сляпая

Трымаючыся за рукі каханая
мы пляцём чарадзейны шнур.

## Хлопчык у чырвонай канфедэратцы

Усе дзеці бегаюць
з голымі галовамі
па падворку
толькі адзін хлопчык
у чырвонай канфедэратцы
з зялёнымі зоркамі

Яго маці
выглядвае праз акно
і крычыць
«Здымі гэта з галавы
чуеш
будзь як іншыя дзеці»

# З КНІГІ «ПЯЦЬ ПАЭМ»
# 1950

## Прызнанне

Замест столькіх галоў
я хацеў прырабіць ім адну
гожую як касцельная вежа

Я хацеў даць
адно аблічча
шэрай масе
якая
свеціцца пад залеваю поту

Я ішоў і пісаў
каб засяліць
белыя плямы на мапе
ўяўлення І тут сутыкнуўся
з жывымі людзьмі
з іх вачэй часам цяклі слёзы
а ў грудзях
сціскалася і расціскалася сэрца
і толькі галава была нямая
і голая нібыта молат
мы не знайшлі агульнае мовы

Цяпер я вучуся гаварыць
наноў.

*1949*

## Крылы і рукі

Калі адыходжу далей
не спыняй мяне
гэта шлях у святло

рукі з усіх бакоў
жвавыя рукі
разрываюць мяне распінаюць

і пачынаецца цікаванне
і пачынаецца гульня
святла і рук I з’яўляюцца цені

На белых аблоках
цені рук і крылаў
хоць няма паміж намі анёлаў.

## Вежа са слановай косці

Апусціўшы галовы
на якія сыплюцца пыл і сівізна
са звялымі тварамі
На замшавых лапах
са схаванымі кіпцюрамі
яны бегаюць вакол
зруйнаванай вежы

Будавалі яе са шчыта
на вясёлцы і на ружы
без падмурку і сценаў
а калі зямля зварухнулася
вежа ўпала хаваючы многіх

Ацалелыя бегаюць вакол
на замшавых лапах І дрыжаць.

## Адказ

*Edel sei der Mensch*
*Hilfreich und gut!*
Goethe

Што хоча ад мяне
паэзія
Няўжо ахвярнасці
самоты меланхоліі
Каб праз натоўп я ішоў
як праз паветра

Калі паэзіі патрэбна
самота
ахвярнасць
і адчай
адкінь яе
Няўжо любоў да жонкі
ці да дзіцяці
якому я купляю
маленькае адзенне
клопат пра маці
няўжо ўсе чалавечыя пачуцці
паэзію знішчаюць

Прыдумай новую
яна будуецца
з пачуццяў зразумелых
з простых словаў

Няхай адніме ад чалавека
жывёльнае і боскае

Няўжо я мушу збегчы
з дому ўночы
у навальніцу
і паміраць
дзесь на паўстанку на якім
чыгуначнік грымотна абвяшчае
нязнаныя мясціны

Гляджу на дым які ідзе
у неба над дахамі
майго мястэчка

ў асветленых дамах там людзі
якіх люблю
якім раздаў я вочы вусны рукі
і адбіраю

Бо кожны прагне адчуваць
апірышча ў іншым чалавеку
і плача ўночы.

# З КНІГІ «ЧАС, ЯКІ МІНАЕ» 1951

## Сачу вачыма

Аблокі плывуць над домам
дзе праходзіць маё жыццё

чорныя буркліва перавальваюцца
над зямлёй
светлыя мінаюць
нібы і не было

Ўрастаю ў жыццё
штораз усё глыбей і шырэй
слабы сачу вачыма
за аблачынамі
і мацней люблю зямлю
стаптаную людскімі нагамі

## Не смею

Спустошаны
смехам і словам
пабіты
малымі пачуццямі й клопатам
паўкаханнем
і паўнянавісцю
там дзе трэба крычаць
я кажу шэптам

Ведаеце гэты голас
ламаецца ў сухой гартані
як трыснёг
старыя вершы спадаюць з мяне
пра новыя не смею нават марыць
пра новую паэзію
якую
можна прадчуць
у хвіліну шчасця

# З КНІГІ «ВЕРШЫ І КАРЦІНЫ» 1952

## Паэтыка

I

Чыста спявае
паэт
які служыць
добрай справе

Ён абмінае могілкі
вобразаў слоў
Рассоўвае школы і рэквізіты
кранае сэрцы і рэчы
піша простыя вершы

Распадаюцца словы
у якіх адабралі любоў
без яе наша песня
як гудзенне кузурак
як колер васковых пладоў
як крык духавых інструментаў
як лаянка п’янога
як маўчанне прадмета

Спеў без любові
мёртвы
ад яго адвернецца люд
абыякавы і няўмольны

II

Я думаў
што словы лёгкія
нібы пух
ільсняныя бы ядваб
круглыя як каленкі дзяўчат
бесклапотныя як галасы птушак
я думаў
што паслухмяна
прыбягаюць на кожны кліч
што з іх можна складаць карціны
шматзначнасць якіх
хавае ў сабе багацце

У маім жыцці былі
словы развітання
і словы нянавісці
а потым словы любові
а потым я бачыў
выдрапаныя
на сценах турмы
словы надзеі
Усе яны былі
адназначнымі
не было сярод іх
параўнанняў і метафар
перыфраз і гіпербал
Але мелі ў сабе моц думкі
і моц росту
і мелі сілу стварэння

*1951*

## Вобраз

*Карнэлю Філіповічу*

I

Цёмныя знямелыя травы
ляжаць на дне
мёртвага святла

Яблыні што зіхацелі на сонцы
агністымі фарбамі
згаслі

Плод затрымцеў у лісці
і паляцеў на зямлю
ў ноч

Ты са мной
нашы плечы
дакранаюцца
шукаючы цяпла
ў цемры
Твой шырокі твар
прагне адказу
спакойны твар
працоўнай жанчыны
з маленькімі дзіцячымі
вуснамі

Плод затрымцеў у лісці
і ўдарыўся аб зямлю
Бачыш – кажу –
Нашы мары:
цішыня дом цяпло
вокны і дзверы шчыльна
зачыненыя

паўверы і паўнадзеі
паўпраўды і паўсвятасці
паўпакуты і паўсяброўства
прыстанак развагі кукалка амбіцыі
Мары як птушкі
без крылаў
падаюць

Ты зрабіла раптоўны рух
быццам хацела зацiснуць мне рот

II

Я казаў далей

Гара пакрытая снегам
не ўзнялася ў неба над намі
вяршыня яе ікол лёду
не запалала
паміж згаслых яблынь

Не праваліліся ў хмары каменныя вадаспады
не павыскоквалі тыгры
з зубамі белымі быццам іней
са скалы не пабеглі
спаласаваныя сонцам патокі
з сярэдзіны неба
не выплыў арол

Я хто не верыць
у відзежы паэтаў
апісваў гэты вобраз
чорна-белы
ўзнікала слова за словам
без колеру і без музыкі:

Атрады Кітайскай народнай арміі
наступаюць у Тыбеце
Марш адбываецца на вышыні
больш за чатыры тысячы метраў
над узроўнем мора
праз горы пакрытыя снегам
праз шматлікія бурлівыя рэкі
сярод бураў і снежнай завеі

Я казаў далей

III

Плод затрымцеў у лісці
і паляцеў на зямлю

Святло абудзіла колеры і галасы
атуліла
твары знямелых

Рукі іх перапляліся
адкрытыя вочы
можа бачылі вобраз далёкі
ён рос

вобраз надзеі
вызнанне веры
ўзвышэнне мараў

## Успамін дзяцінства

Пры дзённым святле
ён быў вясёлы як птушка
між ясных мячоў сонца
набрынялых крывёю

Жоўты паветраны змей свяціўся
ў клубах дыму
як вока цмока

Хлопец верыў ён птушка
ляцеў праз зялёны луг
і крычаў

Уначы мяне перасьледуе
яго часты подых

Стол на якім падпіраю галаў
быццам пень
сьцятага дрэва

## Сведка

Ты ведаеш я тут
ды не ўваходзь знянацку
ў мой пакой

магла б убачыць
як я маўчу
над белым аркушам

Ці можна пісаць
пра каханне
чуючы крыкі
зняслаўленых і забітых
ці можна пісаць
пра смерць
гледзячы на твары
дзяцей

Не ўваходзь знянацку
ў мой пакой

Пабачыш нямога
і збянтэжанага
сведку любові
якую перамагае смерць

## Мяшчанская смерць

Гэта зусім не раптоўная смерць

Гэта не смерць салдата
што атрымаўшы ўдар кулаком снараду
падае павярнуўшыся тварам да неба

Гэта не смерць старога селяніна
што вяртаецца ва ўлонне зямлі
спакойна быццам дадому

Аднойчы
у адзін з многіх
дзён аднолькавых
як дзве кроплі вады
пры дзённым святле
або сярод ночы
пачынаецца паміранне

Гэта зусім не раптоўная смерць

Калі перастаеш
з дня ў дзень
ненавідзець і кахаць
калі адкрываеш залатую сярэдзіну
пачынаецца паміранне

# З КНІГІ «СРЭБНЫ КОЛАС»
# 1955

## Спальванне вершаў

Расказваю гісторыю
не надта цікавую

спальванне вершаў
адбываецца ў цішы
гэта абрад
пазбаўлены пафасных
жэстаў

спальванне вершаў адбываецца
сярод звыклых дэкарацый
стол тры крэслы
кніжная шафа

гарыць аркуш
таньчыць полымя
дым ідзе ўгору

Калі нараджаліся словы
крычаў
цяпер маўчыць

## Спрабуе

Паэзія часам
нагадвае
дзіцячую ручку
хацела б схапіць усё

Ручка акунуўшыся
ў свет
спрабуе закрыцца

Спрабуе змясціць
плод
яго дасканалую форму
сама ж слабая
адкрытая
і плод выпадае
штораз цяжэйшы і большы

## Каханне 1944

Безабаронныя голыя
з вуснамі на вуснах
шырока
расплюшчыўшы вочы

прыслухоўваючыся

мы плылі
праз мора
слёз і крыві

*1954*

## Мастачка ў Стары-Сончы

Шэрая вясёлка вулак
мінаем навослеп
круцім навокал галовамі
далей
хутчэй гучней

Яна
адкрывае
колер смутку і радасці
колер цішы
колер маркоты

калі галаву схіляе
з яе чорных пасмаў
вылятаюць
птушкі

## Удалося

Янку адзін год
ён поўзае на карачках
аднойчы
гляджу
а ён
стаіць на дзвюх ножках

«Ну – думаю з палёгкай –
удаўся зноў гэты фокус
нашага старога чалавецтва»

## Готыка 1954

Рэбры памерлага Бога
выгнутыя
над словамі
вернікаў
слепа

Бог
нябесны вожык
наколаты на тысячы шпіляў вежаў
бораў банкаў
сыходзіць крывёй
людзей
не сваёй

мехам золата на шыі
яго цягнуць
на дно
асуджаныя

# З КНІГІ «ПАЭМА ШЧЫРАСЦІ»
# 1956

## Паэма шчырасці

### Лук

З ночы як з похваў
выняты біч

цярплю жывёльнае жаданне
з заплюшчанымі вачыма
падганяны ўдарамі крыві
гнаны як у статку
здратаваны

адкрываецца маё цела

жывёлы выскокваюць
моўчкі абнюхваюць ноч

спіна першай каханкі
выгнуты залаты лук
у цемры
напялася знерухомела

## Бяздумна спяшаючыся

Як мы сябе калечым
бяздумна спяшаючыся
як мы сябе калечым
узаемна бязлітасныя
на людзях чуйныя
беспамылкова наносім удар
пратыкаючы сябе
навостраным лязом
удзень і ўночы
ляжым у цемры
з вузкімі сціснутымі
ледзянымі вуснамі

ляжым побач з забытымі целамі
а кожны з нас паасобку кажа
якая пакута
навошта ўсё гэта
кажам самі сабе
варушачы вуснамі

## Успамін першы

Яна спачывае побач
штораз усё слабейшая
старэе
без апірышча ў сабе
без апірышча звонку
зусім распранутая
ўся ў шнарах ад уцехаў
ўся ў шнарах ад ранаў
кахання дзяцей
Ён глядзіць на яе
ўспамінае дзяцінства:
суседа які лавіў пацукоў
у жалезную пастку
прыходзіў
са сталёвым прабойнікам
і прабіваў пацука
раз за разам
на ўзыходзе сонца

## Мур

Праз гэты мур які
мы будавалі разам
дзень пры дні
дадаючы слова
да маўчання
праз гэты мур
прабіцца мы не можам

замураваныя
ўласнымі рукамі
паміраем ад прагі
чуем як побач
варушыцца іншае
чуем усхліпы
просім паратунку

нават слёзы хаваюцца
ў глыб нашых целаў

## Успамін другі

Восень
Яна стала ў акне
халоднае сіняе вока
рукі пакрытыя
плямамі жоўці
чырвоныя пазногці

Твой белы капялюшык
сарваны ветрам
ляціць
плыве па сцежцы
сярод цярноўніку
ты даганяеш яго
смяешся і крычыш

Увесь час бяжыш
лаўлю цябе за плечы

## Што было схавана

Што было схавана
адкрыта
мы пранікалі адно ў аднаго
як пранікае
ў зямлю паветра
агонь у ваду
нашы целы дрыжалі
нашы вочы былі заплюшчаныя

Калі ты спаў
у цёплым жываце ночы
са скалелымі вуснамі
скруціўшыся ў клубок
я шаптала сэрцу
ціха ціха
куды хочаш выскачыць

ён застанецца тут
назаўсёды
ён не прачнецца

## Людзі людзі

Што было схавана
адкрыта
ладзім прадстаўленне
для дарослых і дзяцей
салдатаў і студэнтаў
хатніх гаспадынь

навокал стаяць людзі
прыглядаюцца гавораць
смяюцца ківаюць галовамі

Ты прычапіў сабе
пазуры іклы рогі
я доўгі востры язык
ты б’еш сябе ў грудзі
глытаеш нажы
рвеш ланцугі
кроіш маё сэрца

мы стаім на галаве
ходзім на руках
жанчына з залатым сэрцам
мужчына з вачыма дзіцяці
жанчына і мужчына
ў адной асобе

людзі людзі
цуды ў нашай будзе
ў гэтай нашай будзе

людзі людзі
пашкадуйце
кіньце крошку любові

## Развязаныя рукі

Калі б яна памерла
развязала б мне рукі

Што звязаў той чыноўнік
у чорным паношаным гарнітурыку
што мы падпісалі ў той дзень
у прысутнасці двух сведкаў
што мы сказалі
пацвердзілі
што казаў той чыноўнік

зычу вам шчасця

дзверы зачыніліся

калі б яна памерла
развязала б мне рукі

## Голас

Калечацца і катуюць
маўчаннем і словамі
быццам у іх наперадзе
яшчэ адно жыццё

робяць так
нібы забыліся
што іх целы
смяротныя
што нутро чалавека
лёгка знішчыць

бязлітасныя да сябе
яны слабейшыя
за расліны і жывёлаў
іх можа забіць слова
усмешка позірк

## Гэта не можа скласціся

Уставаць рана
класціся ў ложак
выбіраць з меню
мераць рукавічкі
цалавацца
нараджаць дзяцей
шпацыраваць
гуляць у карты
слухаць патэфон
піць гарэлку
піць чорную каву
мазаць
шараваць
упрыгожваць
насіць плечкі
насіць пярсцёнкі
глядзецца ў люстэрка
міргаць
рабіць міны
рабіць кар’еру
рабіць тое і гэта

Значыць паміраць

азірацца
на ногі жанчын
пляскаць і мармытаць
расказваць досціпы
мяняць асяроддзе
лячыць вантробы
вочы зубы валасы
усе органы
лашчыць сабак
балець
дзівіцца з феерверкаў

пазяхаць
гаварыць увесь час
хутка гаварыць
кпліва ўсміхацца
прыкідвацца
чытаць дзённікі
глядзець на карціны
купляць спальню з арэху
насіць гадзіннік
насіць вусы
насіць капялюш
насупліввацца і падлізвацца
уваходзіць
выходзіць
выконваць
хлусіць

Значыць паміраць

глядзець на слана
глядзець на малпаў
узгадваць
расказваць сны
чакаць
здымаць капялюш
граць на трубе
заплюшчваць вочы
моршчыць лоб
паказваць калені
фарбаваць вейкі
купляць кветкі
гэта ўсё
і сто іншых спраў
і сто тысяч іншых спраў

Гэта ўсё цэлае
якое не можа скласціся

## Чакаю

Як гэты час цягнецца
як для нас цягнецца
гэты час

Ужо позна іду спаць
ты нешта казаў
нічога я не казаў
мне здалося

яшчэ ёсць час
раскажыце адно аднаму ўсё
што збіраліся зранку
столькі год

Я бачыў у сне вялізную рыбу
спачатку зварухнулася вада
пасля чорная спіна
рыба плыла хутка
з чырвонай ад крыві галавой
перавярнулася
засвяціла белым жыватом
крывавымі жабрамі
нібы веерам
хутка рухалася па пяску
што значыць гэты сон
што значыць гэтая рыба
пэўна здарыцца нешта благое
цяпер чакаю толькі
кепскіх навінаў
прыслухоўваюся да крокаў на сходах
да стуку ў дзверы
гляджу на яго вусны
бяру ў рукі аркуш
адчыняю дзверы
нашага дома
і заўсёды чакаю
кепскіх навінаў

## Дурны жарт

Памятаеш гэты стары анекдот
гэты дурны жарт
«у мяне дома новая мэбля»

тут паставім ложак
там паставім стол
тут паставім люстэрка
там шафу
завесь фіранкі на вокнах
тут будзе маё месца

аддай мне ложак
вазьмі сабе стол
вярні мне маладосць
дай мне крэсла
вазьмі сабе святло
забірай усё

памятаеш гэты дурны жарт
«у мяне дома новая мэбля – жонка»

## Можа гэта быў не дом

Можа гэта быў не дом
той дом
у якім плачуць рэчы
цяпер усё зразумела
гэта была звычайная чакальня
чакальня на чыгуначным вакзале
якую ўсе пакідаюць
у прызначаны час
там застаюцца прылады
посуд
драбяза
якімі скарыстаюцца іншыя людзі

## Седзячы за сталом

Седзячы за сталом
у чакальні чытаючы газету
можна падумаць без гневу
як доўга я буду сядзець
за гэтым сталом
з гэтай жанчынай

можа пасля абеду
адчынім дзверы
і кожны пойдзе ў свой бок

дзе я бачыла гэтага чалавека

пацірае рукою лоб
і ўзгадвае
гэты чужы твар гэты ўздых за газетай
голас
гэтыя рукі якія ўцякаюць
ад маіх рук

***

Мы рухаемся
рухаемся хутчэй
мы спяшаемся
шторaз шпарчэй
круцімся
вакол
але няма цэнтру
ёсць многа дамоў якія стаяць
але няма цэнтру
ёсць многа шляхоў якія ідуць
але не ідуць да цэнтру

*жнівень 1955 – сакавік 1956*

# Заслоны

I.

Гаманкая тканіна галасоў
атуляе людзей і рэчы

словы – заслоны
што падаюць
у цішыні
адкрываючы формы і колеры

заслона дзяцінства
сатканая з мноства сонцаў
струменяў птушак дрэў
з жэстаў і рук
з вуснаў і слоў падае

заслона маладосці
медныя чорныя хмары
б'юцца над маўклівымі палямі
кроў сплывае з аблічча зямлі
прарастае зялёная надзея

II.

Заслона дзяцінства

рукі поўныя любові
вешаюць першую заслону
рукі мамы
яны даюць хлеб з малаком
здабываюць агонь з дрэва
адкрываюць святло

заслона дзяцінства
першая зорка
першы снег
агонь вада паветра зямля
вялікія вочы страху
заслона дзяцінства
таньчаць мядзведзі
сабакі граюць на бутэльках
папяровыя чырвоныя насы
смерць з касой
факір забіты бліскучай шабляй

словы – заслоны
якія падаюць у цішыні

III.

Заслона маладосці
з бліскавіцаў і хмараў
са шкляных гор
паветраных замкаў
з танца чырвоных сэрцаў
з гарачых галоў

адкрыццё свету
разбітыя сэрцы
медныя лбы
стаптаны гонар
смярдзючая багна

блазан на троне
каханне на продаж
лес які рушыў
і пайшоў у агонь

медныя чорныя хмары
б’юцца над маўклівымі палямі
сэрца грукоча ў вострыя рэбры
калечыць нас сэрца
у якім жыве страх
кроў сплывае з аблічча зямлі
прарастае надзея
нараджае жыццё

заслона маладосці падае
парваная
ад неба да зямлі

*лістапад 1954 – кастрычнік 1955*

## Хутчэй

Адлегласць што аддзяляе
назіральнікаў
ад таго чалавека
вялікая
не далятаюць сюды галасы
відаць толькі рухі
яны паўтараюцца

цёмныя рухі
на светлай фіранцы

ходзіць па пакоі
падымае рукі ўверх
заломвае рукі
датыкаецца твару

што адбывалася там

у яго адкрытыя вусны
можа прасіў дапамогі
але адкрытыя вусны жаху
і вусны смеху
вусны болю
і вусны асалоды

што адбывалася там

там гінуў свет
чалавека
усё жыццё
ляжала ў руінах

ці рухаючы рукамі
складаў тое што нельга скласці
ці не мог адшукаць
ні кроплі надзеі

чалавек упаў

што рабіў гэты чалавек
падымаючы рукі
змагаўся ці здаваўся
ішоў на дно
ці падаючы ўзносіўся

людзі ўжо беглі
набліжаліся

яго твар быў
як разбітае люстэрка

*жнівень 1955*

## Чараўніца

Адыходзячы
яна ўсмешкай
асвяціла краявід
вакол мяне

шэрыя дамы
якія я мінаў
расфарбавала ў маіх вачах

адзін стаў чырвоны
другі белы
агароджаны жалезным плотам

у гэтым доме пакой
у які ўваходзіць яна
адчыняе акно глядзіць у сад
бачыць зялёныя дрэвы
ў святле сонца
у святле месяца
чорныя кароны

адварочваецца
ўваходзіць у люстэрка
расплятае валасы
маімі пальцамі
глядзіць на сябе
маімі вачыма
хоць я ад яе далёка
іду па вуліцы чужога горада
настаўляю каўнер
бягу заскокваю ў трамвай
трамвай
звініць у косым дажджы

яна ўсміхаецца
прыадкрывае раскрывае
атачае мяне закрывае

Яблык які яна кінула
год таму
круцячыся
ўпаў мне ў далонь

тры стагоддзі таму
у восеньскі поўдзень
у зялёнай Нысе
тапілі чараўніцу
у біскупстве Ныса
што было залатым яблыкам
сярод біскупстваў

святло станавілася цемрай
святло цела
святло ў форме дзяўчыны
сонца жывата
над чорным келіхам

вусны раскрытыя
пад небам
на якім прыбіты
тры залатыя кароны
як тры цвікі

*1955*

## Шпора

Сёння напаў на мяне
вампір нябыту
кпіў з усяго жыцця
з крышталёвых вяршыняў
і плыткіх бяздонняў
катаваў кідаў
з кута ў кут
з дому на вуліцу

толькі калі
ён пабачыў карусель
і белыя ногі дзяўчыны
ў небе
і прычоску
яе кавалера
які перакладваў
з рукі ў руку
хлеб з каўбасой
ён суцішыўся
заплюшчыў вока
якім мяне раніў
зранку як шпорай
з зоркі

## Я крычаў уночы

Я крычаў уночы

Мёртвыя стаялі
уваччу
з ціхай усмешкай

лязо цемры
ўваходзіла ў мяне
халоднае мёртвае

яно адкрыла
маё нутро

*жнівень 1955*

## Дрэва

Драўляны Хрыстос
з сярэднявечнай містэрыі
паўзе на карачках

увесь у чырвоных стрэмках

у цярновым ашыйніку
з апушчанай галавой
пабітага сабакі

якое галоднае гэта дрэва

## Крышталёвае нутро бруднага чалавека

(*Карыкатура*)

I.

Шкадуйце што не можаце ўвайсці ў мяне

Назаўжды застаняцеся звонку
ў гэтым свеце ілюзій і хаосу
дзе лямпа – гэта лямпа
а свіння – гэта свіння
вы бачыце мяне з чорнага боку
ў фальшывым святле

Сёння расчыню перад вамі
ўсе брамы
што вядуць да майго нутра
там пабачыце цуды
пры якіх гасне сонца
а вісячыя сады Сэміраміды
аблятаюць як звялае лісце

Апыняцеся ў крышталёвым нутры
майго духу
з раскрытымі ратамі
і скажаце самі сабе
які ён добры шляхетны чысты
які верны мужны просты
які сціплы ціхі лагодны
які вялікі разумны светлы
які нявінны бязгрэшны
ён каму не трэба
ні лямпы ні сонца
бо ён сам святло

перад вачыма паўстануць
леў і авечка
змяя і галубка
вол і асёл
мышка і пiраміда
Праметэй прыкуты
пасля катаванняў

гэта я
восень у розных абліччах
якога вы бачыце
ў бруднай скуры
а маё нутро
быццам чыстае золата
быццам празрыстае шкло

Калі я гляджуся ў сваё нутро
не магу не дзівіцца
ці ёсць на свеце другое такое
чыстае нутро глыбокае нутро
адчуваю заварот галавы
і млосць

А вы гледзячы на мяне
звонку
памыляецеся
бачыце мае брудныя рукі
бачыце мой раздвоены язык
расшчэплены на канцы
у ім атрута і слодыч
атрамант і сліна
бачыце мой зморшчаны лоб
слабое чалавечае сэрца
і жоўць што залівае мяне
і расце
як чорнае сонца на пустым небе

Падайце ж мне рукі
людзі сляпыя маленькія людзі
правяду вас унутр
у крышталёвы палац
збудаваны з любові да вас
як гняздо ластаўкі з бруду
ён поўны спеваў вісіць
па-над прорвай жыцця

II.

Заплюшчыце вочы
калі святло майго нутра
аслепіць вас
і распачнецца млосць і галавакружэнне
крышталёвы палац
які вы хвіліну таму аглядалі
толькі змрочны халодны
парог

цяпер правяду вас
у другое маё нутро

Вось другая мая сярэдзіна
закрытая белая лілея
чыстая як крыло анёла
(гэта метафара
ў анёлаў я не веру)

Непаразуменне
тлумачыцца тым
што вы бачыце мяне звонку
ў чорным святле
падайце мне рукі
станьце тут
там дзе стаіце
з таго боку лепей відаць

не штурхайцеся
што за быдла
ну цяпер уваходзьце ў мяне
глядзіце
я паказваю вам цяпер
сапраўднае аблічча
уваходзьце ў маё другое нутро
разяўляйце раты
кажыце самі сабе

вось ён сапраўдны
варочае горы
не капае ямы
іншым
вось ён другі
вогненны куст
наш сокал

о людзі малыя бедныя простыя
не спявайце мне хваласпеваў
у чорным святле
з гадамі я забрудзіўся
заплюшчыўшы вочы
справядліва судзіў іншых
забіваў нявінных
хоць мой нож
быў чысты як сляза
падайце мне рукі
ідзіце за мной
пойдзем далей

III.

Вось трэцяе нутро
адчыняю яго перад вамі
выцірайце ногі рукі насы
заплюшчвайце вочы

белая лілея
раскрыйся да дна
венчык распусціся
адна празрыстая сляза
схавана ад свету
угледзьцеся ў крышталёвую кроплю
што цячэ з майго вока

Я бегаю тут між суквеццяў
вершыкаў і смецця
за зоркамі матылькамі
тут скідаю тры брудныя скуры
заліваюся тут слязамі
тут свячу анёльскімі валасамі
тут сохнуць
мае брудныя сукні
за сямю гарамі
за сямю лясамі

*верасень – кастрычнік 1955*

## Пакіньце нас

Забудзьцеся пра нас
пра наша пакаленне
жывіце як людзі
забудзьцеся пра нас

мы зайздросцілі
раслінам і каменню
зайздросцілі сабакам

хацеў бы я быць пацуком
казаў ёй тады

хацела б я не быць
хацела б заснуць
і прачнуцца пасля вайны
адказвала заплюшчыўшы вочы

забудзьцеся пра нас
не пытайце пра нашу маладосць
пакіньце нас

## Таямнічае слова

*Ежу Тхужэўскаму*

I

Гэтае слова
праглынутае на палову
расло ўва мне
гуло ў нечакана
спусцелым свеце

адарвалася ад мяне
гнала з месца на месца
прымаючы розныя колеры
сэнсы формы

я хацеў злавіць яго
зняволіць
а яно множылася
напаўняла твары чужых людзей
кнігі мэблю
помнікі
целы жанчын
мяса хлеб

палохала

я не мог пазнаць яго
перададзенае з вуснаў у вусны
двухсэнсоўнае
яно выскалялася

я шукаў паратунку
ў малюнках дзяцей
дзе людзі падобныя да катоў
і ходзяць у зялёных
цыліндрах

дзе сонцы чорныя
і квадратныя
дзе

я шукаў паратунку
у слоўніках
расчытваў з надзеяй

палок
празектарская
прарок
праскрыпцыя
пратакол
пратаплазма
прынцыповы

я хаваўся ў стылістыках
сярод капрафагаў мегафонаў
сатырыкаў філатэлістаў заўзятараў
на выставе канарэек
у картатэках
у жыціях пакутнікаў
між зорак
між ног жанчын
у раскладах
руху

вусны ночы і дня
расціснуліся

II

Складаю побач з сабой
чорныя й белыя квадраты
ў шахматным парадку

Ці можа існаваць
больш ясная кампазіцыя

III

Неба вісіць нада мной
як яйка
у якім жоўтае сонца
корміць
кроплю крыві

у святле
мая галава падае
раз за разам
як каменны молат

упёрты ў зямлю
чатырма нагамі
падымаю галаву

## У цэнтры жыцця

Пасля канца свету
па смерці
я патрапіў у цэнтр жыцця
я ствараў сябе
будаваў жыццё
людзей звяроў краявіды

гэта стол казаў я
гэта стол
на стале ляжыць хлеб і нож
нажом крояць хлеб
хлебам харчуюцца людзі

чалавека трэба любіць
вучыўся я ўночы і ўдзень
што трэба любіць
адказваў я чалавека

гэта акно казаў я
гэта акно
за акном сад
у садзе бачу яблыньку
яблынька цвіце
квецень ападае
плады завязваюцца
выспяваюць

мой бацька зрывае яблык
чалавек што зрывае яблык
гэта мой бацька

я сядзеў на ганку дома
тая старая што
цягне казу за аброць
больш патрэбная
і каштоўная

за сем цудаў свету
хто думае і адчувае
што яна непатрэбная
той забойца

гэта чалавек
гэта дрэва гэта хлеб

людзі харчуюцца каб жыць
паўтараў я сабе
жыццё чалавека важнае
жыццё чалавека мае вялікую вагу
вартасць жыцця
большая за вартасць усіх прадметаў
якія стварыў чалавек
чалавек гэта вялікі скарб
паўтараў я ўпарта

гэта вада я казаў
і лашчыў рукою хвалі
і размаўляў з ракою
вада я казаў
добрая вада
глядзі гэта я
чалавек размаўляў з вадою
размаўляў з месяцам
кветкамі дажджом
размаўляў з зямлёю
птушкамі
небам

маўчала неба
маўчала зямля
калі ён пачуў голас
які гучаў
з зямлі вады й неба
гэта быў голас іншага чалавека

*1955*

## Пасмяротная рэабілітацыя

Мёртвыя згадваюць
нашу абыякавасць
мёртвыя згадваюць
наша маўчанне
мёртвыя згадваюць
нашыя словы

Мёртвыя бачаць нашыя вусны
нашыя ўсмешкі да вушэй
мёртвыя бачаць трэнне
нашых целаў
мёртвыя чуюць
цоканне языкоў

Мёртвыя чытаюць нашыя кнігі
слухаюць нашыя прамовы
сказаныя так даўно
мёртвыя штудуюць рэфераты
бяруць удзел у дыскусіях
ужо скончаных
Мёртвыя бачаць нашыя рукі
складзеныя для воплескаў

Мёртвыя бачаць стадыёны
хоры групы якія скандуюць

усе жывыя – вінаватыя

вінаватыя малыя дзеці
якія падносілі букеты кветак
вінаватыя каханкі
вінаватыя

тыя якія ўцяклі – вінаватыя
і тыя якія засталіся
тыя якія казалі так
і тыя якія казалі не
і тыя якія маўчалі

Мёртвыя лічаць жывых
Мёртвыя нас не рэабілітуюць

# З КНІГІ «ФОРМЫ»
# 1958

## Формы

Гэтыя формы калісьці так добра прадуманыя
паслухмяныя заўжды гатовыя прыняць
мёртвую матэрыю паэзіі
спалохаўшыся агню
вырваліся і разбегліся

кідаюцца на свайго творцу
раздзіраюць яго і цягнуць
па доўгіх вуліцах
дзе ўжо даўно прайшліся маршам
усе аркестры школы і працэсіі

мяса што ўсё яшчэ дыхае
набрынялае крывёй
вось корм
для гэтых дасканалых формаў

так шчыльна налятаюць на здабычу
што і маўчанне не пранікне
вонкі

*снежань 1956*

## Не маю адвагі

Гэты свет такі чужы
як прадмет знойдзены ўночы
маё жыццё такое нецікавае
з гэтага жыцця
аднак
крышталізую нячыстую паэзію

Крытык у акулярах усміхаецца
не магу
яму патлумачыць
сам мусіць разгадаць
загадку

У тыдні сем дзён
у суботу ўвечары
адчыняюцца дзверы
не маю адвагі выйсці

тыя папяровыя пачуцці
тасаванне брудных карт

а гадзіне 22 прыйшла
смерць і кажа
не пішы больш гэтых слоў
сядзь роўна
адкладзі пяро апусці рукі

*красавік 1958*

## Ёў 1957

Зямля неба цела Ёва гной
неба гной
вочы гной
вусны

тое што зачата ў каханні
што расло сталела
тое што цешылася
ператворана ў гной

зямля неба цела Ёва
ружа гной
вусны гной
неба

што атуляла пяшчота
што аздабляла годнасць
што ўзвышалася
ўпала

па небе па сонцы
па цішы па вуснах
поўзаюць мухі

*ліпень 1957*

## Разладжаны

Усе ўспаміны ўяўленні пачуцці веды
паняцці досвед што напаўнялі мяне
не ладзяць паміж сабою не ўтвараюць цэлага
ўва мне
часам даплываюць да мяне да берага
маёй памяці датыкаюцца скуры
лёгкім дотыкам сточаных кіпцюроў
Не буду маніць
я не ёсць цэлым я стаў разбітым разладжаным
хто ж нахіліцца хто зацікавіцца гэтымі часткамі
я сам настолькі заняты
хто можа ўспомніць форму майго нутра
у гэтай сумятні ліхаманкавым руху
на калідоры дзе процьма дзвярэй адчыняецца і зачыняецца
хто адновіць форму якая
не адбілася ні ў белай крэйдзе
ні ў чорным вугалі
калі нечакана спытаюць
я сам не змагу ўспомніць

кажуць пра мяне: ён жывы

*жнівень 1956*

# Дзверы

Муляры сыходзячы
пакінулі ў сцяне вертыкальны праём
Часам думаю
што маё жытло надта ўмоўнае
сюды лёгка ўваходзяць
розныя людзі

Калі б муляры не пакінулі
таго праёма ў сцяне
быў бы пустэльнікам

на жаль
нядаўна мне ўставілі дзверы-вяртушкі
уваходзячы і выходзячы
марную свой час

праз гэтыя дзверы
ўваходзяць справы таго свету
ніколі не стаялі ў іх
яблынька ў квецені
малое жарабятка
з вільготнымі вачыма
зорка і залаты вулей
ручай поўны рыбаў
і незабудка

не замурую аднак тых дзвярэй
можа стане ў іх
добры чалавек
і скажа мне хто я

## Ліст да людажэрцаў

Дарагія людажэрцы
не глядзіце ваўком
на чалавека
што пытае пра вольнае месца
ў вагоне электрычкі

зразумейце
ў іншых людзей таксама
дзве нагі і азадак

Дарагія людажэрцы
пачакайце хвілінку
не тапчыце слабых
не скрыгачыце зубамі

зразумейце
людзей шмат будзе яшчэ
больш таму пасуньцеся трошкі
саступіце

Дарагія людажэрцы
не скупляйце ўсіх
свечак матузкоў крупаў
Не кажыце адвярнуўшыся спінай:
я мне мой маё
мой страўнік мой волас
мой мазоль мае штаны
мая жонка мае дзеці
мая думка

Дарагія людажэрцы
не з’ядаймася Добра
бо не ўваскрэснем
Напраўду

*1957*

## Сустрэча

Усё часцей сустракаю мёртвых
яны нязвыкла ўзрушаныя
іх вусны адкрытыя яны шмат гавораць
некаторыя з іх пеняцца
як мыла

апошні раз я сутыкнуўся з большай колькасцю мёртвых
якія сядзелі радамі ў крэслах
мелі чырвоныя твары
смяяліся пляскалі сядалі
абураліся ўставалі
рабілі персанальныя выпады

сярод старых трупаў
з'явіліся маладыя
яны ў няведанні
ў разгубленасці
рухаюць рукамі і нагамі
вядуць машыны заваёўваюць новыя
пасады і чужых жонак

толькі стары дасведчаны нябожчык
падміргнуў мне
хітравата
і паспрабаваў яшчэ раз
нарадзіцца
на вачах сабраных

*лістапад 1956*
*(на З'ездзе пісьменнікаў у Варшаве)*

## Кампазіцыя ў трох абліччах

I

Мы з’елі з ім пуд солі. Можна было б добра спазнацца, праўда? Між тым, аказалася, што ён ужо зусім іншы. Таму мы з’елі другі пуд солі. Але ён зноў змяніўся. Пачалі трэці пуд. Прыглядаемся адзін да аднаго з усё большым здзіўленнем.

II

Якім гэты хлопец зрабіўся шэрым, убогім, нудным. Яшчэ трыццаць год таму ён бачыў за горадам на яблыні Святога Духа, які сядзеў у зялёнай кароне, а на кожнай галінцы віселі чырвоныя яблыкі. Умеў размаўляць з дажджом і снегам, заўважаў месяц, хмары, мурашоў. Ведаў, калі стары конь плача, а калі смяецца. Абуджаны ўночы, каяўся ў грахах і абяцаў змяніцца. Меў душу і цела.

III

Памятаю яго добра, гэта быў зусім іншы чалавек. Сапраўды, быў цяжкі і нязграбны, але часам рабіў нечаканыя рухі і з яго прабівалася іскра.

Ён быў чалавек няўклюдны і цёмны, які мог стаць раптам распаленай паходняй. Цяпер ён бясследна знік. Толькі форма ўбрання, капелюша, ботаў робіць з яго цэлае, што карыстаецца тым самым імем і прозвішчам, як і тыя двое памерлых.

*1957*

# З КНІГІ «РАЗМОВА З ПРЫНЦАМ»
# 1960

***

Хто звязаў мне рукі

стаўлю знакі на дарозе

гэты азначае птушку
гэты неба
гэты азначае птушку
без неба
без крылаў
без вока

не падобна да рук раскінутых для палёту

## Размова з прынцам

I

Зямлю прабілі іклы
не спускайце
сабак
з ядвабнай шворкі

будуць грызціся
скуголіць віскатаць
ці не чуеце
булькату
ў гартанях

напятыя
да апошняга
дрыжаць нашы
выдрэсіраваныя
жаданні

II

That’s a faire thought
to ly between Maids
legs

Прынц
проста выказваў
свае пачуцці думкі
гэта вучоныя-кніжнікі
ўсё ўскладнілі
цудоўная думка

свет раптам адкрыўся
твой убогі родны
Прынц о Прынц
адзін з тваёй світы
Містар Пруфрак заўважыў
што яго лысіна
разрастаецца і ўпаў у гамлетычны
настрой

блукаючы паміж
людзей ім прыручаных мэблі
ён лічыць за і супраць
лежачы між ног
вернай дамы
ён несвабодны
ад рэфлексіі
лічыць страты й набыткі
пацее ад страху
і дадае шаленства
да страху
смак пажаднасці змешвае
з думкамі пра рост цэнаў
заплюшчвае вочы пацее і лічыць

замест шпагі выцягвае
руку з кішэні
грызе пазногці
хаваецца
хавае ў ножны
і крычыць
быць быць быць
любой цаною

III

Прынц не кажы
пра мяне з пагардай
у мяне добрыя жаданні
два разы ў сне
я лётаў па небе
ведаю я – дупа чыноўніка
мая грыва
мой гнеў зніклі
усё не так як ты думаеш
з ранку да вечара
я мяняюся
няспынна
я падатлівы
на мне можна
адціснуць любы знак
ты – пячатка
а я воск свету
Прынц браце мой Прынц
Афелія
крылы анёла
ўцягнула ў сябе
якраз нараджае грэшнікаў
у гэты момант

IV

Прынц
я не чыноўнік
я сучасны
паэт
у нас год 1958
табе цікава што робіць
сучасны паэт

Абыякавы звяртаецца
да абыякавых
аслеплы падае знакі
невідушчым
смяецца і
брэша праз сон
прачнуўшыся
плача
складаецца з прыступак
але ён не лесвіца Якава
ён голас без рэха
цяжар без вагі
блазан без караля

Пытаеш пра форму той хмары
гэта ж сапраўдны вярблюд
кажаш яна больш падобная
да ласкі
кажаш што хутчэй да кіта
вельмі падобная да кіта
смяешся з мяне
добры Прынц
пазнаеш схаванага за дыванам
дурня

## Выйсце

я
ўпарты
і мяккі ў гэтай упартасці
быццам воск
толькі так я магу
зняць злепак са свету

## Кара

Ужо сёння
ў гэта імгненне
жыццё без веры вырак
прадметы становяцца багамі
цела становіцца богам

бог гэты жорсткі і сляпы
свайго адэпта паглынаеператраўляе
і выдаляе

## Новы чалавек

Новы чалавек
гэта той там
так гэта тая
каналізацыйная труба
прапускае праз сябе
ўсё

## Страх

Ваш страх вялікі
метафізічны
мой малы чыноўнік
з партфелем

з картатэкай
з анкетай
калі я нарадзіўся
чым зарабляю на хлеб
чаго не зрабіў
у што не веру

што тут раблю
калі перастану звяртацца
куды звярнуся
потым

## Зычлівасць

Зямля варушылася
варочалася як вялікі крот
гэта былі
пахаваныя жыўцом

слухаю
твае словы ўспаміны

гляджу на жывот
тваёй жанчыны
ў якім варушыцца
дзіця

вырваныя з пятлі
адзін аднаму ўсміхаемся
зычліва і цёпла

## Помнікі

Нашы помнікі
двухсэнсоўныя
маюць форму ямы

нашы помнікі
маюць форму
слязы

нашы помнікі
будаваў пад зямлёй
крот

нашы помнікі
маюць форму дыму
ідуць проста ў неба

*1958*

## Дапаўненне

Гэты бок
звернуты да людзей
і хаця ён зацёрты
зменлівы крывадушны
ён дае ўяўленне
пра маю форму

другі бок
які невядомы нікому
які ніколі не ўбачыць
дзённага святла
якога да смерці і пасля смерці
не крануць іншыя людзі

той другі бок
ведаю толькі я
ён жыве ў схоўні
але ўплывае на бок
яўны
і праз яго сутыкаецца з людзьмі

яны ж
здзіўленыя
яны ўражаныя
яны шакаваныя
ўскрыкваюць
адкуль гэта ўзялося ў яго
гэта да яго не падобна
гэта зусім іншы чалавек
у вядомым партрэце
з’явіўся новы двухзначны штрых
ашаламіў
і дапоўніў

## Смерць

Сцяна акно
за дзвярыма
галасок дзіцяці

за акном вуліца
трамвай
уваходзіць цар Ірад
д’ябал смерць

даю цару залатоўку
і выганяю ўсю грамаду
за дзверы

смерць
сапраўдная
азіраецца
і грозіць мне пальцам

## Невядомы ліст

Але Ісус схіліўся
і крэсліў пальцам на зямлі
потым зноў схіліўся
і крэсліў на пяску

Мама яны такія цёмныя
выбачай што я мушу паказваць
цуды раблю такія смешныя
непатрэбныя рэчы
але ты разумееш
і даруеш сыну
ператвараю ваду ў віно
ўваскрашаю мёртвых
хаджу па моры

яны нібы дзеці
ім трэба ўвесь час
паказваць штосьці новае

Калі да яго падышлі
вучні
засланіў і замазаў
літары
назаўжды

## Новыя параўнанні

З чым параўнаць
дзень
ці з ноччу
з чым параўнаць яблык
ці з царствам
з чым параўнаць
цела
ўночы
цішу
паміж вуснаў
паміж
з чым параўнаць вока
руку ў цемры
правую з левай
зубы язык вусны
пацалунак
з чым параўнаць
бядро
валасы
пальцы рукі
подых
маўчанне
паэзію
ў святле дня
ўночы

## Тры профілі паэта

I

### Паэт набіты

Ён сядзіць на скале, злепленай з літаратурных штотыднёвікаў. Сядзіць нерухома. Яго цудоўная галава з вострай дзюбай і шкляным вокам абуджае пашану і змушае захоўваць дыстанцыю. Яго кіпцюры раздзіраюць дурняў і зласлівых сабратаў па пяры. Вы ж ведаеце гэты здымак. Па небе плывуць літаратурныя хмары, па зямлі ў сваіх жа адходах поўзаюць дурні. І толькі ён бязгрэшны. Распраўляе свае вялізныя крылы і пачынае кружыць над літаратурным бязмежжам. Уздымаецца штораз вышэй і вышэй. Што можа быць больш смешным за палёт пудзіла. З яго нутра сыплюцца апілкі.

II

### Паэт-блазан

Паэт-блазан – частая з’ява. Нават таленавітыя і выбітныя паэты любяць блазнаваць. Адсюль столькі анекдотаў пра паэта, столькі вясёлых успамінаў. Усе ведаюць яго маскі. Не бачылі яго сапраўднага твару, нават пасля смерці. Узгадваюць блазна. Паэт-блазан паміж дзвюма жырандолямі ў чырвоным каўпаку на галаве. Пасля кожнага руху звінелі званочкі, вабячы разяваў, прыхільнікаў і ворагаў. Калі ж ён сустракаў чалавека, здымаў з галавы блазенскі каўпак. І пры стале станавілася ціха, яго вялізныя рукі ляжалі на цыраце. Рукі працаўніка. Нахмурана і слепа ён углядаўся ў чалавека, які сядзеў насупраць. Унутры нараджаўся нясмелы і крыху іранічны смех. Тады ён заплюшчваў вочы.

III

**Паэт-дрэва**

Паэт – чалавек адкрыты і безабаронны. Бярэ на сябе ўсе ўдары, нават прызначаныя іншаму. Яшчэ далей, глыбей. Ён нават не пакутнік, не гэта зраненае цела. У сучасным свеце ён толькі дрэва, да якога прывязана цела іншага чалавека. Стрэлы працінаюць цела, і іх вострыя наканечнікі ўтыкаюцца ў дрэва. Дрэва можа толькі трымаць і маўчаць. Такія змены адбыліся цягам стагоддзяў. Цудоўнага дрэва, якое было домам песні і казала чалавеку: «Госцю, сядай пад маім лісцем і адпачні», – стала сухім дрэвам шыбеніцы. Гэта дрэва, акоранае, ператворанае ў кол і ўбітае ў нутро зямлі, нясе на сабе чалавека-пакутніка, які ведае і думае пра тое, што ён самотны.

## Анёлак яшчэ не скончаны

Анёлы і анёлкі, якія абляпілі нутро старога касцёла, напалоханыя, устрывожаныя. Можа, праз хвіліну ўзнясуцца да скляпення, паляцяць у гіпсавае неба.

Добрыя людзі, карыстаючыся тым, што анёлкі яшчэ сядзяць на сваіх месцах, з імпэтам узяліся аднаўляць анёльскія целы.

Цяпер анёлы ззяюць новай, задзірлівай прыгажосцю. Вочы, схаваныя чорнай іглiцай веек, свецяцца, як валошкі. Белыя гладкія тварыкі заліваюцца чырванню. Сардэчкі вуснаў пачуццёва прыадкрытыя. Чалавек, на якога павесілі анёлкаў, нават не забыўся зрабіць на босых ножках педыкюр. Меншыя анёлкі выглядаюць як вырадкі, а дарослыя – як кацяры, што прыляцелі ў касцёл адразу з начной рэстарацыі. Новая шкарлупіна шчыльна пакрыла няшчасных істотаў, якія калісьці былі анёламі.

Толькі на адным з бакавых алтароў анёлы сядзяць у старых, зношаных строях. Праз тонкія, як туман, фарбы свеціцца яснае, цёплае дрэва. Сухія рукі, на якіх вены сплятаюцца з абрысам касцей пясці і пальцаў, лягчэйшыя і прыгажэйшыя за сатканыя з залатых пёркаў крылы.

Адзін з тых чатырох анёлаў ужо пачаты рэстаўратарам. Выцягнутая ў неба, лакіраваная белая рука ззяе чырвонымі пазногцямі. На другой руцэ вісіць картка з надпісам: «Анёлак яшчэ не скончаны».

# З КНІГІ «ЗЯЛЁНАЯ РУЖА» 1961

## Змаганне з анёлам

Цень крылаў рос
анёл закрычаў заспяваў
а яго вільготныя
ноздры датыкаліся
маіх вачэй вуснаў
мы біліся на зямлі
утаптанай з газет
на сметніку дзе
сліна кроў і жоўць
змяшаліся
з гноем слоў

цень крылаў рос
і былі гэта крылы
два
ад вуха да вуха вялізныя
ружовыя
абапал галавы
сярод хмараў
адкіды нашыя пакрылі
стадыён
і вось ён перамог мяне
звязаў асляпіў абслініў
словам і балбочучы
аптымістычна
ўвайшоў у неба паэзіі
я схапіў яго за нагу

ён упаў на мой сметнік
да мура
я тут
чалавекападобная істота
з набітымі святлом
вачыма

*1959*

## У дзённым святле

Іншыя яшчэ
сядзяць у цемры
утульна
з цукеркай у роце
чакаюць
драмы або камедыі

на белай прасціне
жанчыны вочы якіх
расплюшчваюцца і заплюшчваюцца
а ў ратах раяцца
ўстаўныя зубы
распранаюцца
на вачах сабраных

з аголеных целаў
плыве смех
разам з музыкай
і дыялогам

усё тут
забаўна ашаламляльна
цікава
больш прыгожа
чым у рэальным свеце
раптам змізарнелым
нясмачным

Калі герой душыць
ці пакрывае
гераіню
пацалункамі
гледачы кідаюць смактаць
цукерку
сядзяць разявіўшы рот

іх твары павернуты
да белага палатна
што выпраменьвае
фасфарычны бляск

У дзённым святле
сапраўдныя слёзы
мізарнеюць і блякнуць
брыдка выглядае
рэальная жанчына
што сядзіць пры муры
і плача
ў яе чырвоны нос
нефарбаваныя склееныя
вейкі
скручаная панчоха
на левай назе

***

Кідалі зямлю на труну
на адкрытыя вочы
на святло

ён глядзеў на іх
збоку
адыходзячы
глыбей

застаўся ў роднай мове
як дзіця
ва ўлонні маці

не адсеклі яго
не выкінулі
расце

## Блазан

Гэты блазан
быў надта мудры
каб смяяцца
з іншых

надта мудры
значыць смутны

таму смяяліся з яго

адно Караля Старога
прызнаваў сабе
за роўнага
Стары Кароль яго разумеў
таму ён высмейваў Караля

## Домік

я домік для мёртвых
знайшлі яны тут свой
апошні прытулак

рух рук
у мой бок
вазьмі мяне
вазьмі з сабой
не адпускай

і я адкрыўся
яны пасяліліся
ў халодным
пустым
цёмным

такое яно
іх
спрадвечнае ззянне
такое грахоў адпушчэнне
ўваскрэсенне цела

такое вечнае жыццё

## Зняцце цяжару

Прыйшоў да вас
і кажа

вы не адказваеце
ні за свет ні за канец свету
з вашых плячэй зняты цяжар
вы нібы птушкі і дзеці
баўцеся

і бавяцца

забываючыся
што сучасная паэзія
гэта барацьба за дыханне

*1959*

## Я пісаў

Я пісаў
хвіліну ці гадзіну
вечар ноч
апанаваны гневам
я дрыжаў або знямелы
сядзеў у самоце
з вачэй маіх цяклі слёзы
я пісаў ужо так доўга
і раптам заўважыў
што не маю ў руцэ пяра

# З КНІГІ «НІШТО Ў ПЛАШЧЫ ПРАСПЭРА» 1963

## Пра дакладныя прыкметы (так званай) паэзіі

Напрыклад

паэзія губляе сілу
пасля бяссоннай ночы
крыху знямогі
яе змяняе
непазнавальна
ператварае ў жменю слоў
пазбаўленых жыцця
у нешта жудаснае
у кветку папяровую
ў каханне з мяса

паэзія губляе сэнс
апоўначы
апоўдні роўна
і пасля абеду

паэзіі няма
падчас народзінаў
у час смерці
і пры капуляцыі

няма паэзіі
ў гадзіну 22
1 траўня 1961 года

няма паэзіі
ў халодным чалавеку
няма паэзіі
ў гарачым чалавеку
а ў летнім можа жыць
і развівацца

ёй неабходна цішыня

## Кармленне Пегаса

*Памяці Леапольда Стафа*

Нарадзілася жарабятка
са складзенымі крыламі
сляпое
ў крыві

над ім спыніўся язычок агню

і пачалася навука лётаць
на мыліцах
на незгінальных драўляных
крылах

яго стамлёнага жанчына корміць
«муза»
працягвае яму
ў далоні
кавалак цукру

салодкі белы

хавае ад яго
да часу
словы
Фрыдрыха Хрысціяна Гэбеля
паэзія – самазабойства

*1962*

## Нішто ў плашчы Праспэра

раб Калібан
навучаны людской мове
чакае

з пысай у гноі
з нагамі ў раі
абнюхвае чалавека
чакае

нішто падыходзіць
нішто ў чарадзейным плашчы
Праспэра
нішто з вуліц і вуснаў
з амбона і вежаў
нішто з рэпрадуктараў
кажа ў нішто
пра нішто

нішто родзіць нішто
нішто выхоўвае нішто
нішто чакае нішто
нішто пагражае
нішто асуджае
нішто мілуе

*1962*

## Усмешка

Бог упаў

ляжыць на спіне
безабаронны
цяпер яго
вечнае жыццё
адкрытае

нясуць яго
разумныя мурашкі
да труны жывога
ён хрушч
чорны ільсняны
з галавой-шчытам
у залатым німбе

Чалавек прыўзнімае яго саломінкай

глядзіць
усміхаецца
поўнымі
таямніцы
вуснамі

як той
цвердакрылы
цёмны

адлятае

*1962*

# З КНІГІ «ТРЭЦІ ТВАР»
# 1968

## З жыццяпісу

год нараджэння
месца нараджэння
Радомска 1921

так
на гэтым аркушы
са школьнага сшытка сына
змешчаны мой жыццяпіс
засталося яшчэ крыху месца
некалькі белых плямаў

я закрэсліў толькі два сказы
і адзін дапісаў
праз пэўны час
дадам колькі слоў

пытаеш пра галоўныя
падзеі даты
майго жыцця
спытай пра гэта іншых

мой жыццяпіс закончыўся
ўжо некалькі разоў
раз лепш раз горш

*1965*

## Смех

Клетка была так доўга зачынена
што ў ёй вывеўся птах

птах так доўга маўчаў
што клетка расчынілася
іржавеючы ў цішы

ціша так доўга цягнулася
што за чорным дротам
загучаў смех

***

Асізі гняздо
на парэпанай скале
белае птушынае
яйка

я нёс
гэты ружовы
краявід
у мой
горад

не данёс

на трэці дзень
твая ўсмешка
стала псавацца
аддаў Цябе зямлі

рака забыцця
залівае
вочы вусны
твае ступні
ў папяровых
пантофлях

## Талент

Я сядзеў пад мурам
заплюшчыўшы вочы
твар
падстаўляючы сонцу
сціснуўшы рукі
ў кулак

у маленстве анельскім
сельскім д’ябальскім
я падаваў жабракам
манеткі
лусты хлеба
яны паказвалі куксы
пустыя рукавы
разяўленыя зяпы
струпы

адгінаеш палец за пальцам
дзве пустыя далоні
выварочваеш нутро
ўзнімаеш павекі нічога

калі расхісталі
мне зубы расціснулі вусны
пад языком
знайшлі чорную
манету

*1962*

## Першае схавана

першае дрэва

не памятаю
ні назвы
ні краявіду
ў якім расло

не памятаю
ці спазнаў я
тое дрэва вокам
вухам
ці яно было шумам
пахам колерам

ці з’явілася
ў сонцы
ці ў снезе

першая жывёла

не памятаю
яе голасу цяпла
формы

усе жывёлы
маюць свае назвы

толькі тая першая
схаваная
невядомая

*1965*

## Лазанскія вершы

Крыж без плячэй
любоў без веры

паэт

над вадой вялікай
мёртвай чыстай
чакае прышэсця
шарлатана

паэзія
як адкрытая рана
апошняе кровапраліцце

застылы
вобраз свету

## Прасвятленні

варушуся ў сабе
большым
у гэтым цёмным краявідзе
схаваны вобраз
іншы
дзяцінства
поле белае пустое
адкрытае вельмі
далёка ціха
там узнікае
святло

два чорныя аблiччы
і сон

*1967*

## Каменяломня

Каменяломня катэдры
маўчала
звонку
падвешаны на ключы
выкапнёвы бог
святіў
белымі рэбрамі

на дне
запоўненым слінай
да падмурка
маліліся
дзіўныя метафізічныя
сысуны

## Будую

Хаджу па шыбе
па люстэрку
якое крышыцца

хаджу па чэрапе
Ёрыка
хаджу па гэтым крохкім
свеце

і будую дом
замак на пяску
ўсё ў ім
гатова да аблогі

толькі я адзін
разгублены
знадворку
па-за мурамі

## Нішто

Уночы
слова
нішто
расце пашыраецца
гвалтоўна

удзень
траціць сваю
прагнасць

праслізгвае ў жыццё
як нож у мяса

## Пранікненне

смерць
пранікае праз жыццё
як святло
праз павуціну
якая вісіць у дзвярах
адчыненага пакоя

канаючы ён збіраўся
доўга крычаў шукаючы
выйсця ўкладваўся

смерць з’ядала рысы
чарговых твараў накладзеныя
на косць

## Накід сучаснага мілоснага верша

А ўсё ж бель
найлепей апісваць шэрасцю
птушку каменем
сланечнікі
ў снежні

даўней мілосныя вершы
былі апісаннямі цела
апісвалі тое і гэта
напрыклад вейкі

а ўсё ж чырвань
трэба апісваць
шэрасцю сонца даждждом
макі ў лістападзе
вусны ўночы

найяскравейшае
апісанне хлеба
гэта апісанне голаду
ёсць у ім
сыры порысты мякіш
цёплае нутро
сланечнікі ўночы
грудзі жывот бёдры Кібелы

крынічнае
празрыстае апісанне
вады
гэта апісанне смагі
попелу
пустыні
яно выклікае міражы
аблокі і дрэвы ўваходзяць
у люстэрка

Нястача голад
адсутнасць
цела
вось апісанне кахання
сучасны мілосны верш

*лета 1963*

## Адчыняліся дзверы

Адчыняліся дзверы
Праспэра ішоў паперадзе
без плашча і посаха
на лаўках пад афішамі
сядзелі праваднікі-пенсіянеры
ксёндз настаўнік паліцыянт
сярод іх
мой Анёл Абаронца

ён быў хударлявай дзяўчынай
светлыя валасы сплывалі на спіну
на маладыя плечы
блакітныя шаты
хавалі таямніцу
полу

анёле божы мой абаронца
я сказаў набліжаючыся
да яе твару
вачэй вуснаў

малады швед рассмяяўся

*1967*

## З нейкага часу

За некалькі год
працэс памірання паэзіі
значна паскорыўся

заўважаю
што новыя вершы
з’явіўшыся ў штотыднёвіках
разлагаюцца
за дзве-тры гадзіны

памерлыя паэты
адыходзяць хутчэй
жывыя
выкідаюць з сябе
ў паспеху
новыя кніжкі
быццам хочуць заткнуць паперай
дзірку

## Сярод мноства спраў

Сярод мноства спраў
неадкладных
я забыўся пра тое
што таксама трэба
паміраць

легкадумны
я занядбаў свой абавязак
або яго выконваў
павярхоўна

заўтра
усё зменіцца

пачну паміраць старанна
мудра аптымістычна
без марнавання часу

## **Капітуляцыя**

*Для Н. М. Е.*

на ўсіх
маіх вежах снах
на словах
на маўчанні
лунаюць белыя сцягі

на маёй нянавісці
на маёй любові
на паэзіі
застылі белыя сцягі

на ўсіх
мурах краявідах
на мінулым
і будучым
вывешваю белыя сцягі

на тварах
на імёнах
на ўзнясеннях і падзеннях
лунаюць белыя сцягі

з усіх маіх вокнаў
сплываюць белыя сцягі

ва ўсіх руках
трымаю белыя сцягі

*1966*

## Карэктура

Смерць не паправіць
ні аднаго радка ў страфе
яна не карэктар
яна не зычлівая пані
рэдактар

дрэнная метафара несмяротная

дрэнны паэт які памёр
толькі дрэнны мёртвы паэт

назола па смерці назаляе
дурань з магілы
ўсё яшчэ вярзе глупствы

## У тэатры ценю

Са шчыліны
паміж мною і светам
паміж мною і прадметам
з адлегласці
паміж назоўнікам і прыметнікам
спрабуе выбрацца
паэзія

мусім вынайсці
такія прылады
стварыць такія формы
каб зачапіць іх за мяне
і слова
нібы за берагі
якія аддаляюцца
няспынна

разарваная
спрабуе яшчэ раз
наблізіцца
параўнаць
паяднаць
выбіраецца
на паверхню

я сыходжу

*1963*

## Новы верш

*Казіміру Выку*

Прачынаецца сын
што ты робіш
пытае

я
нічога я не раблю
кажу ў адказ

і чую ў сабе нудны голас
нехта прыйдзе
сатрэ вас
з паверхні зямлі
гаварлівая цвіль

закрываю ад яго
пусты твар
праўлю
новы
непатрэбны верш

*1965*

## Апавяданне пра старых жанчын

Люблю старых жанчын
брыдкіх жанчын
злых жанчын

яны соль зямлі

не грэбуюць
людскімі адкідамі

ведаюць адваротны бок
медаля
кахання
веры

прыходзяць і сыходзяць
дыктатары блазнуюць
маюць рукі заплямленыя
крывёй чалавечых істот

старыя жанчыны ўстаюць на світанні
купляюць мяса хлеб садавіну
прыбіраюць гатуюць
стаяць на вуліцы склаўшы
рукі маўчаць

старыя жанчыны
бессмяротныя
Гамлет заблытаўся ў пастцы
Фаўст грае нікчэмную смешную ролю
Раскольнікаў б’е сякерай

старыя жанчыны
незнішчальныя
паблажліва ўсміхаюцца

памірае бог
старыя жанчыны ўстаюць як штодня
на світанні купляюць хлеб віно рыбу
памірае цывілізацыя
старыя жанчыны ўстаюць на світанні
адчыняюць вокны
прыбіраюць памыі
памірае чалавек
старыя жанчыны
мыюць цела
хаваюць памерлых
садзяць кветкі
на магілах

люблю старых жанчын
брыдкіх жанчын
злых жанчын

яны вераць у неўміручасць
яны соль зямлі
кара дрэва
яны рахманыя вочы жывёл

мужнасць і баязлівасць
ганьбу і веліч
яны бачаць у сапраўдных маштабах
набліжаных да патрэбаў
штодзённасці
іх сыны адкрываюць Амерыку
гінуць пад Фермапіламі
паміраюць на крыжах
асвойваюць космас

старыя жанчыны выходзяць на досвітку
ў горад купляюць хлеб малако
мяса гатуюць супы
адчыняюць вокны

толькі дурні смяюцца
са старых жанчын
брыдкіх жынчын
злых жанчын

бо яны прыгожыя жанчыны
добрыя жанчыны
старыя жанчыны
яны яйка
яны таямніца без таямніцы
зямля што ўсё яшчэ круціцца

старыя жанчыны
муміі
святых котак

яны маленькія
зморшчаныя
высахлыя
крыніцы плады
ці тоўстыя
авальныя буды

калі яны паміраюць
з вачэй выцякае
сляза
каб з’яднацца
на вуснах з усмешкай
дзяўчынкі

*1963*

## Кароткі змест

Гляджу ў акно
дождж у цёмных шатах
дрэў
нізка залатыя
лубіны
расказваю майму сына *Гамлета*
кажу пра цень які
пра пацука за парцьерай
лагоднага пустаслова
бацьку вар'яткі

думаю пра гладкія малочныя клубы
каралевы Маці
пра таямніцу
якую сталеючы
пабачыў сын
нарадзілася і тлела
ў ім каханне
якое трэба было атруціць
якое трэба было адсекчы
і ён сек мячом навослеп
якое трэба было адгрызці
і ён грыз
якое трэба было ўтапіць як сляпое
шчаня
і ён асудзіў на смерць
бязвінную дзяўчыну
даводжу цьмяную інфармацыю
пра жыццё Шэкспіра
3 ліпеня 1962 года
яшчэ адзін чалавек на зямлі
даведваецца
пра існаванне ангельскага драматурга
ідзе дождж чуецца смех
за сцяною варушыцца мыш

пытанне
якім задаваўся
Прынц Дацкі
я замоўчыў
гэта надта жорсткі вульгарны жарт
для сучаснага чалавека

*1963*

## Веды

Нічога ніколі не будзе
патлумачана
нічога запоўнена
нічога ўзнагароджана

нічога ніколі

час нічога не вылечыць
раны не загояцца
слова не стане
на месца слова

магілы не зарастуць травой
памерлыя памруць
і не ўваскрэснуць

свет не скончыцца

паэзія пасунецца
далей
у бок Аркадыі
або ў іншы бок

## Мая паэзія

нічога не тлумачыць
нічога не даказвае
нічога не выракаецца
не ўяўляе сабой цэлага
не пакідае надзеі

не стварае новых правілаў гульні
не бярэ ўдзелу ў забавах
мае акрэсленае месца
якое мусіць запоўніць

калі яна не эзатэрычная
калі не гаворыць самабытна
калі не здзіўляе
напэўна так трэба

яна пакорлівая сваёй смяротнасці
сваім магчымасцям
і абмежаванням
прайграе сама сабе

не займае месца іншай
і не можа саступіць свайго
яна адкрытая ўсім
пазбаўленая таямніцы

у яе многа задач
якія ніколі не вырашыць

*1965*

# З КНІГІ REGIO, 1969

## Успамін сну з 1963 года

Мне сніўся
Леў Талстой

ён ляжаў у ложку
вялізны як сонца
у грыве
зблытаных кудлаў

леў

я бачыў яго
галаву
твар з залатой хвалістай бляхі
па якім няспынна
сплывала святло

раптам ён згас
пачарнеў
а скура яго рук і твару
была шорсткай
патрэсканай
як кара дуба

я спытаўся ў яго
«што рабіць»

«нічога»
адказаў ён

з усіх зморшчынаў
трэшчын
паплыло да мяне святло
гіганцкая прамяністая ўсмешка
запалала

*1968*

## Хатнія практыкаванні на тэму анёлаў

Зрынутыя
анёлы

падобныя
да шматкоў сажы
да лічыльнікаў
да галубцоў нашпігаваных
чорным рысам
таксама падобныя да граду
афарбаванага ў чырвань
да нябеснага агню
з жоўтымі языкамі

зрынутыя анёлы
падобныя
да мурашак
да маладзікоў якія ўціскаюцца
пад зялёныя пазногці мёртвых

анёлы ў раі
падобныя да ўнутранага боку сцягна
маленькай дзяўчынкі

яны як зоркі
свецяць у ганебных месцах
яны чыстыя як трохкутнік і кола
у іх унутры
цішыня

зрынутыя анёлы
як адчыненыя вокны трупярні
як вочы каровы
як птушыныя шкілеты
як самалёты ў штопары
як мухі на грудзях палеглых салдатаў

як струны восеньскага дажджу
што лучаць вусны з адлётам птушак

мільён анёлаў
вандруе
па далонях жанчыны

у іх няма пупка
яны пішуць на швейных машынках
доўгія паэмы ў форме
белага ветразя

іх цэлы можна прышчапіць
на пні алівы

яны спяць на століі
спадаючы кропля па кроплі

*1964 – 1968*

## Цёрн

не веру
не веру ад світання
да заходу

не веру ад краю да краю
майго жыцця
не веру так адкрыта
глыбока
як глыбока верыла
мая маці

не веру
калі ем хлеб
п’ю ваду
кахаю цела

не веру ў яго
святынях

не веру на вуліцы
ў полі ў дажджы
паветры
золаце звеставання

чытаю яго прытчы
простыя як колас пшаніцы
і думаю пра бога
які не смяяўся

думаю пра малога
скрываўленага бога
ў белых
хустках дзяцінства

пра цёрн які раздзірае
нашыя вочы вусны
цяпер
і ў час смерці

## Той самы твар

твар паэта
адкрыты супакоены

той самы твар
і зусім іншы

са сцяны
на мяне глядзіць
маска

цяжкім
пустым
вокам

*1968*

## Канец

гэта пачатак

твар
сціснуты
бугрысты
скручаны

завязаны ў адну
пятлю
ў вузел са шнура
з вяроўкі

паволі
пачаў развязвацца
раскручвацца
падаць
у цішыні

звіс

праваліўся
ўвагнуўся

ў страх прыніжэнне
ў канчатковы разгром
у нішто

*1968*

***

Сёння я бачыў Равэну
у сне
ў круглым небе
белыя баранчыкі
на зялёным лузе

святло плыло
праз мяне
залацістае

lacrima Christi

## Па дажджы

Абрынуўся раптоўна
як бог
ва ўлонне Данаі
на сцямнелую адкрытую
даліну

святло
высакаствольнае
плыве па вінаградніку
партала
ліжа
абветраныя грывы
мармуровых ільвоў

на П'яца Сан Руфіна
па дажджы
селянін
трымае
ў далонях пачарнелых
пук зёлак і красак

*1966*

## Сумка

так доўга я шукаў
прыдатнага прадмета
параўнання
з хвіліны калі яна ўвайшла
працягваючы мне руку
мінула паўгады

і ўсё-ткі твар той старой дамы
закрытая сумка
са скуры
кракадзіла

сетка зморшчын
сыходзіцца ў кутках
і разыходзіцца
вусны
нібы маланка
два радочкі белых зубоў

адкрытая
цэлая
дамская
сумка з якой высыпаюцца
жаночыя штучкі позіркі
жэсты ўсмешкі

*1968*

***

яшчэ ў сне

па блакітным моры
плывуць караблі

шорсткія сухія
валасы перасыпаюцца
праз мае пальцы

маячыць у тумане
постаць дня
паволі я саджуся
на мель

яшчэ ў сне
сплывае белы карабель
далёка ад мясціны
дзе знерухомеў я

даўгія караблі
чырвоныя і чорныя
ржавеюць

## Альфа

мая левая рука
ілюмінуе
кнігу
спаленых аслепленых забітых

песня тая не
ацалела

мая левая рука
малюе
белую
нібы адзінарог
і нерэальную
літару
з таго свету

# Перавыхаванне

паэт размаўляе
аднолькавай мовай

з дзіцём
правакатарам
святаром
палітыкам
паліцэйскім

дзіця ўсміхаецца
правакатар пачуваецца абсмяяным
палітык абражаным
святар у небяспецы
паліцэйскі
зашпільвае гузікі

прысаромлены паэт
перапрашае
і паўтарае
яшчэ раз
тую ж памылку

***

рэчаіснасць
якую я сузіраў
праз брудную шыбу
чакальні

пабачыў
твар у твар

слабы
адвярнуўся
ад сваёй слабасці

адвярнуўся
ад ілюзій

на пясках
маіх слоў
нехта пакінуў знак
рыбы
і адышоў

*1969*

# З КНІГІ «БЕЗ НАЗВЫ»
# ВЕРШЫ 1971–1976 ГАДОЎ

## Без назвы

Ноч

У агромністай цемры
ў нябыце
зморшчына
вуснаў
выплёўвае костачку
пераЖаваных
ператраўленых слоў

нафарбаваныя вусны
шэпт
вазьмі
вазьмі ў сон
вазьмі ў вечны сон

цэлы свет
сыдзецца
ў твары
зробіцца роўным гладкім
горы ўвойдуць у даліны
гордзіеў вузел
развяжацца
лёгка
як сіняя стужка
ў Марыліных валасах

шэпт
грэх
вялікі грэх
трывога і трымценне

як мора
смерць ператворыць жыццё
ў малы
смешны гузік
адарвешся ад свету
нібы ад адзення

на лістку
пераплывеш акіян
на лістку
прыклееным да шыбы
на лодачцы
карузлік
Харон Гансвурст
са смешна зморшчанай пыскай
перавязе Цябе на іншы бераг

ты адплываеш

з’едлівы смех грыміць навокал
і смерць памірае
ад смеху

***

аблічча айчыны

айчына гэта край дзяцінства
месца нараджэння
тая малая найдаражэйшая
айчына

места мястэчка вёска
вуліца дом падворак
першае каханне
лес на даляглядзе
магілы

ў дзяцінстве адкрываеш
кветкі зёлкі збожжа
звяроў
палі лугі
словы і плады

айчына смяецца

напачатку айчына
блізка
толькі руку працягні

толькі пазней вырастае
крывавіць
баліць

## Пахаваны ў смеху

пахаваны ў смеху
у смеху ціхім
як снег

мерзну ў смеху
патушаным

скрыгаю зубамі
смеючыся да голай косткі

смяюся
рагачу
паміраю ад смеху
выскаляю зубы

аголены

зламаны няўважлівымі
мінакамі
пахаваны
ў механічным смеху
аўтамат

мой цень
без усмешкі
ідзе
за маім целам
след у след

## Я бачыў дзівоснага монстра

Мёртвы жывы
ён увесь час нараджае
золата

У мёртвы сезон
на старонках жоўтых газетаў
побач з марскім змеем
узнікае
Пабла Пікаса

Монстр
з прагісторыі
мастацтва

ён жыў жыраваў жартаваў
у чэраве свету
на кірмашах

Чвэрць стагоддзя таму
паказаўся ў Кракаве
на вуліцы Кармелітаў
роўна апоўдні

найперш вялікая лысая галава
ў галаве чорныя палымяныя вочы
быў апрануты ў гуральскі сярдак
у руках меў чупагу

абкружылі яго мінакі
разявакі якія збіраюцца
на месцы трагедыі
ці пры піўным ларку

з яго пацямнелых ад сонца
рук вылецеў белы голуб
неверагодна чысты
празрысты

фокуснік
жыў у многіх дамах замках
у атачэнні мёртвых жывых жонак
рэпрадукаваў прадукаваў дзяцей карціны
сто
дзвесце
трыста
мільёнаў даляраў
у Пыскавіцах і Глівіцах
маляры пачалі
фарбаваць пакоі ў пікасы
замест «не будзь такім тыцыянам»,
казаць «не будзь такім пікаса»

Потым прыйшла вестка
што ён памёр што цягнуцца цягнуцца
працэсы адносна спадчыны
памерлы заварушыўся
са сцен прыватных галерэй
мастацкіх салонаў музеяў банкаў
капліц асыпаюцца карціны

растуць у цане

Ён небяспечны
некропаль мастацтва
ружа вятроў
нараджае залатыя дукаты
усміхаецца мне
іранічна знікае
за рогам вуліцы ў космасе

я ж маладзейшы за самога сябе
на дваццаць сем год
іду
на Крупнічую вуліцу
па дарозе купляю
гарбату цукар
сардэлькі і булачкі

дома мяне чакае
заданне:
Стварыць паэзію пасля Асвенціма.

# З КНІГІ «ТРАЎМАТЫЧНЫЯ АПАВЯДАННІ» 1979

***

Я прадзіраўся праз гэты сон
цяжка
да абуджэння
ў струменях цёплых
слёз слоў
ішла да мяне маці
Не бойся ты ж у зямлі казаў я
ніхто цябе больш не пакрыўдзіць не зраніць не абразіць
мама з замагільным страхам
тулілася да мяне
не бойся ты ж у зямлі
ты ўва мне ніхто цябе не абразіць
не зняважыць не зраніць
я прадзіраўся праз гэты сон цяжка
перада мной стаяў Цень

## Перасыпанне

Той шоргат

перасыпанне жыцця
са свету поўнага рэчаў
у смерць

гэта праз мяне
як праз дзірку
ў рэчаіснасці
праціскаецца гэты свет
на той свет

дадумваю да канца
той каго
я шукаў уверсе
чакае ўнізе

у нары
ператварэнне

кволае рыканне
труб прыгнечаных
з макулатуры
згорнутых
з газет

уваскрэсенне мёртвых
разгублена
марнае

## Сыходзячы

*Памяці Казіміра*

Цяпер
сыходзячы
азіраюся
маруджу
нібы чалавек
які нешта страціў
але не шукаю
навокал сябе

часам уночы
ў сабе ці роўна апоўдні
ў сабе
шукаю знаходжу
хтосьадчыняе мяне зачыняе
азіраюся
праходжу

***

Я сядзеў у фатэлі
адклаўшы кнігу
раптам адчуў
біццё свайго сэрца
было гэта так нечакана
нібы нехта чужы ўварваўся ў мяне
і лупцаваў кулаком
нейкая чужая істота
зняволеная ўва мне
было нешта брыдкае ў тым
што яна там трапечацца
незалежна ад мяне
ад маёй абстрактнае думкі

## Абраз

Хто яго пазнае

маці бацька браты
мо тая другая жанчына
твар якой
у замглелым люстэрку
сплывае як дождж

а ты
калі глядзіш на сябе
што бачыш

бачу чалавека створанага
паводле вобраза і падабенства бога
які сышоў

# Дзве мовы

Усе вобразы
я загадаў знішчыць
з чаго цяпер мушу ствараць

бачу збялелых
самагубцаў
паказваюць мне язык
з таго свету

бачу матылька
які прысеў
на гладкай пісанцы
яйцагаловага

бездапаможна распраўляе
крылы ўяўлення
адлятае

унутраная мова
не мае крылаў
слоў якія ўзносяць
да «шчасця чалавецтва»

яна глуханямая сляпая

пень
у сэрцы паэта

## Ладдзя

Не плач
ты ж не любіў яго
цяпер ён прадмет
які трэба вынесці з дому

тактоўна прачыненыя вокны

у маім чорным касцюме
у ладдзі
без вёслаў
адплывае
бацька

драўляная труна
завязла ў кветках
зялёных яловых вянках
папяровых стужках

бацька пражыў
дзевяноста гадоў
памёр у лютым 1977 года

не плач

ты ж не любіў яго
ўваччу невялікая сцэнка
бацька нясе зялёнае дрэўца
сякеру і крыжавіну
прабіраецца
праз глыбокі снег

на стале каляровыя гірлянды
зоркі дожджык

няхай зямля яму будзе пухам

## Так склалася
### (1885 – 1977)

Я паехаў у Чанстахову
на магілу Бацькі
схіліўшыся
над магілай
пагладзіў камень

Зразумеў што «Так склалася»
здзейснілася ператварылася ў кола
замкнулася ў сабе стала
дасканалым
Тое што было бясформенным
неспакойным нядбайным
напоўненым працай і гульнямі
разгубленым
тое што было легкадумным
поўным граху
і глыбокай веры
ў збавенне
тое што было малым і шэрым
спалоханым не гатовым да пакуты
сышло ў зямлю
змяніўшыся

Ойча сказаў я
мой легкадумны стары
ты быў да мяне заўжды добры заўжды без гроша
ўрэшце ты стаў маім дзіцем

Калі я апошні раз быў у цябе
(у 90 дзень нараджэння)
ты прачыніў асцярожна дзверы
ў тваіх згаслых блакітных
вачах
была даль здзіўленне
ты не пазнаў мяне

марудна вярталіся адзін аднаму

твая ўсмешка «гэта ты Тадэк»
помню як ты сказаў
«напішы нешта пасур’ёзней як Рэймант!
твае кніжкі такія тоненькія…»

## Сон

Выгрызлі дзірку
ў дзённым святле
і бегалі
з віскам
праз мае сны

ў мяне ўзіраецца
шчур
блакітныя вочы
праз тыдзень
з’явіўся другі

мой дом
забруджаны

свяцілі хрыбтамі
спустошаныя кнігі

сцяна набракла
новым выразам
я доўга ўзіраўся
ў яе нямую паверхню

надзея і вера
пачалі выдзяляць
непрыемны пах

далоні знаёмых
вырываліся
з маёй рукі
голыя спацелыя

## Траўматычнае апавяданне

грызе пазногці
і дакранаецца вуснаў

усмешка народжаная нясмела
дзесяць гадоў таму
паступова асвятліла
брудны
цёмны падвавельскі
горад

маланка
ўдарыла ў неба
асляпіла раку
акрэсліла
смарагдавыя вежы
на крэйдавым узгорку

няўлоўны цень
між усмешкай
і позіркам
між вуснамі
і вачыма
прымружанымі
на імгненне

валасы сабраныя
ў хустку
збянтэжаная ўсмешка
прысядае
на сценах тварах
акне
мы сядзім
нібы раптам згасла святло

гавару навобмацак
недаверліва стаўлюся
да яе слоў

яна з цёмнага боку
які я наведваю ў сне
і прачынаюся ў жаху

яе твар курчыцца
моршчыцца высыхае
рэшта пяшчоты
збіраецца вакол
ракавіны
малога безабароннага вуха

прагрызеная шчыліна
вуснаў

яе твар распадаецца
ў маіх далонях

# З КНІГІ «НА ПАВЕРХНІ ПАЭМЫ І ЎНУТРЫ» 1983

***

Я спрабаваў успомніць
той прыгожы
ненапісаны
верш

прыдуманы ўночы
амаль спелы
ён патануў
растаў у святле дня

верш быў напэўна
вершам на тэму паэзіі
як перліна
апісвае перліну
а матылёк матылька

часам я адчуваў яго на языку
і неспакойна чакаў
ператварэння
ў слова

той згаслы
ў святле дзённым верш
стаіўся сам у сабе
і толькі часам паблісквае

а я яго не выцягваю
з цёмных глыбіняў
на плыткі бераг
рэальнасці

*1982*

## Паэт падчас тварэння

Паэт падчас тварэння
чалавек які адвярнуўся
спінай да свету
да бязладдзя
рэчаіснасці

Паэт падчас тварэння
безабаронны
яго проста тады збянтэжыць
абсмяяць напалохаць

ён вынырнуў
выйшаў з жывёльнага
свету
на зыбкіх пясках
відаць сляды яго птушыных
ножак

здалёк далятаюць яшчэ
галасы словы
зярністы смех
жанчын

але яму нельга
азірацца
назад

выкінуты на паверхню
спустошаны туляецца ён
па кватэры

закрывае твар
на якім адбіваецца
здзіўленне
блукае ўсмешка

яшчэ не патрапіць
адказаць
на простыя пытанні

ён чуў
подых вечнасці
пачашчаны
перарывісты

*лістапад 1979*

***

*Памяці Гельмута К.*

Я схаваў твар у далонях
Der Tod Todes Angst

я падглядач смерці
што ў маёй мове
жаночага полу

гульня ў хованкі
мы хаваемся
за ўсмешкамі
ён ведае
што мусіць памерці
ўжо праз месяц
праз тыдзень

скажы мне прасіў я
ты цяпер за мяне
мудрэйшы ведаеш
ужо амаль усё

ён гаварыў праз сілу
аднак выразна
я ператвораны ў мяса
я зведзены да мяса
якое пакутуе
вяртанне маё да жыцця
было страшным
я не магу патлумачыць
няможна расказваць
не трэба паправіўся ён

я ўнурыў вочы

прынёс яму верш
чытаў і мой голас зрываўся
ён памёр
а я пражыў ужо 22310 дзён
пропіссю дваццацьдзветысячы
трыстадзесяць

нягледзячы на пякельную спёку горад
з’еў сто цялят
трыста кароў
дзвесце свіней
каня труса
двух галубоў рыбу казулю
дзіка
сто тысяч яек
трыста свіней
пару коней
труса казулю
двух галубоў рыбу
колькі сабак
неафіцыйна

даруй мне гэты жарт сынку

ён усміхнуўся бледна
крануў мяне за руку

я прынёс яму верш
чытаў
мой голас зрываўся

зачыніў
за сабой за ім
дзверы

Калі аблокі плывуць
па небе
пісаць пра памерлага
справа бясконца
смутная

*лістапад 1982*

## На ссячэнне дрэва

*Памяці Яраслава Івашкевіча, аўтара «Садоў»*

У краі карон
пануе няспынны неспакой

дрэва асуджанае
на ссячэнне
белым знакам пагібелі
яшчэ дыхала
галіны і галінкі
чапляліся
за караблі аблокаў

лісце дрыжала сохла
прадчувала смерць

Дрэвы не блукаюць
з месца на месца
у пошуках пажытку
не могуць уцячы
ад пілы і сякеры

у краі карон пануе
няспынны неспакой

ссячэнне дрэва – страта
без цырыманіялу

механічная піла
фыркаючы апілкамі
маланкава ўваходзіць
у кару мякаць стрыжань

падсечанае ў бок
упала дрэва

прыціснуўшы мёртвым цяжарам
травы зёлкі
гнуткія звонкія камлі
дрыготкае павуцінне

разам з дрэвам
пакараны яго цень
празрысты
шматзначны
вобраз
знак
што ўзнікае
ў святле
сонца і месяца

Працавітае карэнне
яшчэ не адчула
страты ствала
і кароны

павольна даходзіць
зямная смерць дрэва
да падземнай краіны

карані суседніх дрэў
датыкаюцца
утвараюць саюзы
зрастаюцца

адзіныя побач з людзьмі і звярамі
жывыя істоты здольныя адчуваць
створаныя паводле вобраза
і падабенства багоў
Дрэвы
не могуць схавацца ад нас

Дзеці бязбольна
народжаныя ў клініках

сталеюць
на дыскатэках
раздзіраныя штучным святлом
і гукам
яны ўглядаюцца ў экран тэлевізара
і не размаўляюць
з дрэвамі

Ссечаныя паваленыя
атручаныя мёртвыя
ляжаць покатам
дрэвы дзяцінства
зелянеюць над нашымі галовамі
ў траўні
кідаюць лісце на магілы
ў лістападзе
растуць у нас
да смерці

*люты 1981*

***

Бясколерны
ён пранікае ў цябе
з кожным удыхам
у святле дня
ў сне
мучыць мяне-цябе
як толькі расплюшчыш павекі
таму і не хочацца іх расплюшчваць
аберуч трымаем
павекі сон
на твары
Бясколерны безгалосы
адкрывае паволі мозг
як бляшанку
здані сяброў
прывіды ворагаў
марыянеткі

чаго ты баішся скажы
я не ведаю
ведаеш

## Вобраз нутра

і ўсё-такі гэта не вобраз
твайго нутра

па некалькіх лініях
можна спасцігнуць жыццё

зазірнуўшы ў сябе
адкажы што ты бачыш

не ведаю

## Верш

Я хацеў апісаць
лістапад
у парку апоўдні

пяць белых лебедзяў
застылых на замглёным люстэрку
вады

я хацеў маляваць
аксідаваныя шэранню
чорныя хрызантэмы

святло на вуснах
прахожай
дзяўчыны

я думаў пра паэтаў
краіны сэрца
яны адкрылі сакрэт
пісання дасканалых твораў
згаслі
але святло іх вершаў
даходзіць да мяне
праз тысячы год

ліст крануўся зямлі

я зразумеў
слёзы абразоў
маўчанне музыкі
таямніцу скалечанай паэзіі

пасля вяртання дадому
мая рука пачала пісаць
верш

глуханямы
ён хацеў існаваць
пабачыць святло
але я не хачу яго пісаць
чую як павольна
перастае дыхаць

*лістапад 1982*

## Святло цень

Калі на мой верш
падае цень
бачу ў ім святло
чэзлае ўпартае
жыццё

маленькая смерць
робіць першыя крокі
хутка сталее
расце
уночы кладзецца
мне на сэрца
на вусны
як мора закутае
ў чорны камень

уночы ты крычаў
кажа жонка
жахліва
вусцішна

гэта смерць ува мне жывым
пракладала хады
крычала ўва мне
як пакінутая пячора
поўная касцей

Калі на мой верш
падае святло
я бачу ў ім смерць
чорнае зерне
сажы
ў залатым коласе
які адплывае
за далягляд

*верасень 1983*

# З КНІГІ «БАРЭЛЬЕФ»
# 1991

## Без

найвялікшая падзея
ў жыцці чалавека
нараджэнне і смерць
Бога

ойча Ойча наш
чаму
як дрэнны бацька
ўночы

без знаку без следу
без слова

Ты чамусьці мяне пакінуў
чаму я пакінуў
Цябе

жыццё без бога магчымае
жыццё без бога немагчымае

ўсё ж як дзіця жывіўся я
Табою
еў цела
піў кроў

магчыма Ты мяне пакінуў
калі я спрабаваў раскінуць
рукі
абняць жыццё
легкадумны

я раскінуў рукі
і выпусціў Цябе

а можа Ты уцёк
не здольны слухаць
майго смеху

Ты не смяешся

а можа пакараў мяне
малога цёмнага за ўпартасць
за пыху
за тое
што спрабаваў стварыць я
новага чалавека
новую мову

пакінуў Ты мяне без шуму
крылаў без маланак
як мышка палявая
як вада якая знікла ў пяску
няўважлівы заняты
я не заўважыў тваіх уцёкаў
тваёй адсутнасці
ў маім жыцці

жыццё без бога магчымае
жыццё без бога немагчымае

*(сакавік 1988 – сакавік 1989)*

***

паэзія не заўжды
прымае форму
верша

праз пяцьдзясят гадоў
пісання
паэзія
можа з’явіцца
паэту
ў форме дрэва
птушкі
якая адлятае
святла

прымае форму
вуснаў
гняздзіцца ў маўчанні

або жыве ў паэце
без зместу і без формы

*(13 кастрычніка 1988)*

***

на пачатку
ёсць слова
вялікая радасць стварэння

напрыканцы верша
пачынаецца
вечнасць

прыслухайся

для памілаваных
яна ператвараецца
ў Бога

а перад паэтам
адкрываецца бездань

праз гады
яго знойдуць
ачысцяць ад бруду
пылу зямлі

камень з неба
пазбаўлены агню
метэор

*1990*

***

*Памяці Канстанцыя Пузыны*

Мой час наступае
час падганяе

што з сабой узяць
на той бераг
нічога

і гэта
ўсё
мама

так сынок
гэта ўсё

і нічога болей

нічога болей

і гэта ўсё жыццё

так усё жыццё

*1989*

## Крэйдавае кола

*Перапісана 7 лютага 1988 года*

жыццё
якое гэта пекнае
дасканалае
замкнёнае кола

маладыя людзі
нешчаслівыя слабыя
спрабуюць вырвацца
збегчы

спрабуюць
ператварыць кола
ў чорны квадрат

Не гарачыся
не спяшайся
не бядуй

не трэба!

цярпліва чакай
не прыспешвай
не накладай на сябе рук

адзінае
сапраўднае выйсце
з гэтага кола
смерць

чакай!

яно прыйдзе само
без высілак слёз

лішніх жэстаў
развітальных лістоў
нарадзіўшыся
скрываўлены сляпы
з крыкам
ты трапіў
у гэты карагод

Тваё кола з крэйды
поўнае цемры і святла
замкнёнае дасканалае
вось апошні Бог
які не памёр

праз смерць
ты выйдзеш з яго

*1978*

# Дэзерціры

I

я чалавек
малой веры
малюся за спакой
тых смертных душ
за цені
што не могуць
знайсці месца
вечнага спачыну
блукаюць між пустым небам
і роднай зямлёй

я чалавек добрай волі
і малой веры
чакаю помніка
невядомаму салдату дэзерціру
усіх армій
усіх войнаў

помнік узведзены
ўпотай ад неба
пад зямлёй
помнік узведзены вачыма
маці жонак сясцёр каханых

помнік узведзены
з сораму роспачы страху
любові нянавісці
помнік без імя і прозвішча

Адвагу дэзерціра
цяжка стрываць
яго родным
хто ўцёк з поля славы

хто ўцёк з бойні
не знойдзе даравання
ў сучаснікаў
і нашчадкаў

хто ўхіліўся ад забойства
забіў сябе сам
і пахаваў жыўцом
у забыцці

увенчаны дубовым лісцем
на галіне дрэва
ці на ліхтары
павешаны ў росквіце сілы
Fahnenflüchtiger
Landesverräter
уцякае да канца свету

«гора таму
хто ў росквіце сілы
не наталіўшы прагі жыцця
паў ахвярай
варожага штылету
гора яму і гора нам
яго суродзічам
і суайчыннікам
душа яго не ведае спакою
блукае сярод нас
зняважаная і абражаная»

II

паэт моліцца за душу
невядомага дэзерціра

памолімся
тыя хто вераць у Бога

і тыя хто вераць у Нішто
за смертныя душы
якія блукаюць
па палях лясах лугах
па вуліцах гарадоў
па касцёлах і цвінтарах
памолімся за дэзерціраў
Першай і Другой сусветных войнаў
вечны спакой
дазволь ім знайсці Госпадзе
Памолімся за дэзерціраў
абарончых і нападніцкіх войнаў
справядлівых несправядлівых войнаў
памолімся за тых што кінулі
знакі мундзіры
зброю і штандары
«Не забі»
сказаў Бог
і змоўк
«Gott mit uns»
сказаў чалавек
і рушыў на вайну
з крыжам
у руцэ

Клічу Вас
на Пераклічку Палеглых…
Дэзерціры!
Усіх армій свету!
хай ганаровая варта
дасць залп і пацэліць
ў вашы сэрцы галовы
завязаныя вочы

хай вашы таварышы
яшчэ раз расстраляюць
вашы імёны

вашы цені
памяць пра вас

панаванне правадыроў
генералаў катаў
забойцаў працягваецца

яны кіруюць войнамі
і мірам
правам жыць
і правам паміраць
а маці нараджаюць далей
нараджаюць герояў
нараджаюць дэзерціраў
нараджаюць людзей
бедныя чалавечыя істоты
адзіныя сысуны апранутыя
ў аперэтачныя мундзіры

пад стракатымі штандарамі
рыхтуюцца да вайны
да вайны да вайны
рыхтуюцца да апошняга
выступу
ў тэатры вайны

а я чакаю
помніка
невядомаму дэзерціру
усіх армій свету

# З КНІГІ «ЗАЎСЁДЫ ФРАГМЕНТ»
# 1996

## Звеставанне

звеставанне паэзіі
будзіць у чалавеку
поўным жыцця
пярэпалах

водбліск слова
зіхатлівага ў цемры
язычок агню
над знямелаю галавою

галовы равеснікаў
коцяцца далей
більярдныя шары
на зялёным полі

малады чалавек
адкідае крылатае слова
усміхаецца
паціскае плячыма

я не люблю паэзію кажа
не ведаю што з ёй рабіць
збянтэжаны ён пакідае
бацькоўскі дом

змучаны вандроўкай
кленчыць перад люстэркам
спалоханы ўцякае
і становіцца раптам паэтам

закохваецца
ў сябе
паглынае яго horror vacui
паэт запаўняе
пустэчу словамі
так доўга чэрпае
з крыніцы што дастае
да камянёў
па дарозе губляе словы
слепне запальвае жоўтую
маленькую свечку
перад агромністым сонцам

крыніца з якой выцякае
жывая паэзія
побач

цёмныя постаці
мыюць у ёй рукі
заплямленыя крывёй

бяздомны сабака
хлебча ў цішы
ваду

*1995*

## Нявыказанае

зараз пачнём размову
словы заслоняць
тое што адбылося
раней
па-за намі
без выйсця

ты яшчэ не ведаеш пра гэта

працягваеш руку
думаеш што я ёсць
у тым месцы
дзе ты мяне пакінула

азіраешся
адыходзіш
у тупік

стаіш
нерухомая пахмурная
праўда паволі пранікае
ў тваё сэрца

нашы словы становяцца бяздомнымі

***

пусты пакой

пусты?
аднак у ім ёсць я

я ёсць я пішу
ўслухоўваюся ў цішыню

на падушцы след
ад тваёй галавы
сцірае
разгладжвае
час

## Хатняе заданне

хатняе заданне
для маладога паэта

не апісвай Парыж
Львоў і Кракаў

апішы свой твар
па памяці
не ў люстэрку

у люстэрку ты можаш зблытаць
праўду з яе адбіткам

не апісвай анёла
апішы чалавека
міма якога праходзіў учора

апішы свой твар
і падзяліся са мною
яго зменлівым выразам

яшчэ не чытаў я
ў паэзіі польскай
добрага аўтапартрэта

***

чаму паэты п’юць гарэлку

п’юць бо ведаюць
што ў іх сядзіць
і што яшчэ можа
з іх выйсці

п’юць бо не могуць слухаць
таго што кажуць ім іншыя
і таго што яны кажуць
самі сабе

п’юць бо хочуць падкласці свінню
калегу па пяры
а цвярозыя
яны надта шляхетныя

п’юць да люстэрка бо баяцца
пабачыць ў ім таго іншага
лепшага і «прыгажэйшага»
ты люстэрачка
скажы…

п’юць бо ведаюць што ўжо
напісалі
і не ведаюць што яшчэ
напішуць

***

віхор грукаўся ў вокны

будзіў

сны павуцінне трызненні

неба было медным

трава ліловай
алавянай
чорнай

звер
помесь гіены і ліса
пысай прыгнуўшыся да зямлі
прынюхваючыся
нёсся ў густую цемру

на мяжы сну
і явы
я падумаў
адчуў
што гэта я
бягу ў бок цвінтара
да магілы

з жыватом поўным камення
цёмны звер
пад чырвоным небам
бягу штораз хутчэй
хоць ведаю што там мяне
чакае дол

кладуся спаць
захінаюся ў плед
бягу лячу

не стрымліваю бегу

прачынаюся
з ротам набітым
пяском

*ноч з 16 на 17 студзеня 1992*

## Чаго было б шкада

усмешкі Вяславы
калі яна кажа дзень добры
і дабранач

і калі нічога не кажа

калі зачыняе за мною дзверы
і адчыняе

пасля доўгай вандроўкі
пасля вяртання
з чужой для яе краіны
дзе я ствараў верш

чаго было б шкада

цішы між нашымі тварамі
і слоў якія не былі
сказаны
бо ўсё боскае
між людскімі істотамі
няспынна шукае
сабе выяву

чаго было б шкада

«цэлага жыцця»
і яшчэ нечага
вялікага чароўнага
па-за словам
па-за целам

# З КНІГІ «ШЭРАЯ ЗОНА»
# 2003

## Павуціна

чатыры шэрыя панны
Нястача Бяда Віна Клопат
чакаюць недзе далёка

чалавек нараджаецца
сталее
стварае сям’ю
будуе дом

чатыры ведзьмы
стаіўшыся ў падмурку
чакаюць

будуюць чалавеку
іншы дом
лабірынт
у тупіку

чалавек жыве кахае
моліцца і працуе
напаўняе дом надзеяй
плачам смехам
і трывогай

чатыры шэрыя панны
гуляюць з ім
у хованкі
тояцца ў скрынях
шафах бібліятэках
жывяцца рукавічкамі пылам

нафталінам брудам
з’ядаюць кніжкі
згасаюць шэра ціха
ў халодным святле месяца
сядаюць на папяровых кветках
дзеці пляскаюць у далоні
хочуць забіць матыля і моль
але моль робіцца цішынёю
цішыня музыкай

чатыры шэрыя панны чакаюць

чалавек запрашае
іншых людзей
на хрысціны паховіны
вяселлі хаўтуры
срэбныя залатыя юбілеі
праз замочную шчыліну
нязваныя ўваходзяць у дом
чатыры шэрыя панны

першай з’яўляецца Віна
за ёй маячыць Клопат
паволі расце Нястача
шчэрыць зубы Бяда

дом становіцца павуцінай

у ім чутны галасы і енкі
скрыгат зубоў
гудзенне

абуджаныя багі
адмахваюцца
ад назойлівых людзей
пазяхаюць

***

на дарозе
майго жыцця
якая была роўнай
а часам
знікала за паваротам
гісторыі

былі выбоіны

на дарозе жыцця

якой ішоў
ляцеў
кульгаў
згубіўшы па дарозе
праўду
якую я шукаў
у цёмных месцах

часамі на той дарозе
я сустракаў
дзяцей маіх сяброў
маіх дзяцей

я назіраў як яны вучацца хадзіць
я чуў як пачынаюць гаварыць

у іх вачах былі пытанні
загадкавыя дзеці
з карцін
Вайткевіча
схаваўшыся ў кутках
услухоўваліся ў нашыя размовы
пра жывапіс паэзію і музыку
часамі хныкалі
ўсміхаліся маўчалі

загадкавыя дзеці
з карцін Макоўскага
плоскія блазны
з накладнымі
чырвонымі насамі
і з соплямі пад носам
яны ўсміхаліся

а мы гублялі ўпэўненасць у сабе
(«ну што ты так глядзіш?»)

былі мы так занятыя
і раптам
заўважылі што нашы дзеці
маюць дзяцей
маюць
паразы й перамогі
яны сівеюць
пытаюцца ў нас
«ну што ты так глядзіш?»
а мы маўчым
хаваемся ў кутках

*2002*

***

*Было, мінула […]*
*Найлепей было б звар’яцець*
(Т. Канвіцкі «Вечаровыя зоры»)

Мінулае зноў
пачынаецца

найлепей было б звар’яцець
маеш рацыю Тадэк
але нашае пакаленне не вар’яцее
дарэшты
не заплюшчвае вочы

нам не трэба завязваць вачэй
нам непатрэбныя раі
розных вер сект і рэлігій

з перабітым хрыбтом
мы паўзём усё далей

так Тадэк пад канец
мусім усё перажыць
адпачатку
ведаеш гэтак жа добра як я
часам мы шэпчам
усе людзі будуць братамі
у лабірынце жыцця
сустракаем
непазнавальныя твары сяброў
ворагаў
без імёнаў

чуеш мяне
раскажу Табе сцэнку з мінулага
зноў уцякаю

ад здані якая
захінуўшыся ў халат неба
стаіць на зялёным лузе
і кажа мне невядомай мовай
я гасподзь бог Твой
які вывеў Цябе з дома рабства

усё пачынаецца адпачатку

зноў пан Турскі
мой настаўнік спеваў
глядзіць на мяне прыгожымі
салодкімі вачыма
Амара Шарыфа

а я спяваю
*...рэчанька-рэчанька (...)*
*беражком няроўная...*
ведаю што фальшыўлю
але пан Турскі ўсміхаецца
мне з года 1930
і ставіць «пяцёрку»
пан Турскі ў духмяным
дзівосным воблаку
экзатычным і таямнічым
для пачатковай школы
у павятовым мястэчку
паміж Чанстаховай і Пётркув-Трыбунальскім
усміхаецца
і забірае ў магілу
сваю таямніцу

калі ўрэшце мінулае
скончыцца

# З КНІГІ «ВЫЙСЦЕ»
# 2004

## Залатыя думкі на чорным фоне

толькі прачнуўшыся
маю чорныя думкі

чорныя думкі?

можа паспрабуеш апісаць
іх форму змест

адкуль ведаеш
што яны чорныя

магчыма яны квадратныя
ці чырвоныя
залатыя

акурат!

залатыя думкі

залатыя лускі ў мёртвым моры
стомленай мовы

хоць бы гэтыя з Гогаля
«нішто так не супакойвае
як гісторыя»
ці
«са смехам не жарты»

і яшчэ адна думка
якую павінны абдумаць

маладыя людзі
і людзі ў «росквіце сіл»

«кепска было б на свеце
без старых людзей»

PS
не было б каму саступіць
месца ў трамваі
а чаго варта жыццё
без добрых учынкаў

## Палец на вуснах

вусны праўды
стуленыя

палец на губах
кажа нам:
прыйшоў час

маўчаць

ніхто не дасць адказу
на пытанне
што такое праўда

той хто ведаў
той хто быў праўдай
сышоў

## Апошняя размова

замест таго каб адказаць
мне на маё пытанне
ты прыклаў палец да вуснаў

сказаў Ежы

няўжо гэта знак
што ты не хочаш
што ты не можаш адказаць

гэта і ёсць мой адказ
на тваё пытанне
«які сэнс мае жыццё
калі я павінен памерці?»

прыклаўшы палец да вуснаў
я ў думках Табе адказаў
«жыццё мае сэнс толькі таму
што мы павінны памерці»

жыццё вечнае
жыццё без канца
гэта быццё без сэнсу
святло без ценю
рэха без голасу

# З КНІГІ «І ШТО З ТАГО ШТО Ў СНЕ» 2006

## І што з таго што ў сне

я пішу на вадзе

з некалькіх сказаў
з некалькіх вершаў
будую каўчэг

каб хоць што ўратаваць
ад патопу
які нас заспявае знянацку
і змывае з паверхні
зямлі
калі поўныя радасці
мы паварочваем твары
да бога сонца
і таго Бога
які
«не гуляе ў косці»
нам невядома Нічога
пра трэшчыны ў вантробах
старой Маці-зямлі
мы ўзводзім замкі
з пяску
мы будуем
на мяжы
жыцця і смерці

наша Маці-зямля
блакітная круглая
схаваная ў вэлюм аблокаў
напоўненая плоднымі водамі
жыцця
поўная вулканічнага агню

паміж дзвюма белымі шапкамі
лёду зялёная з пахам жывіцы
з лёгкасцю сплюшчаная
пасля крывавых войнаў
аргазмаў
рэвалюцый
засынае

пра райскі сад
пра багоў на Алімпе
пра Бога ў нябёсах
ўздыхае прыгажэе
набіраецца сілы
румянца глыбока ўздыхае
адпачывае па творчай эвалюцыі
як маці-ваўчыца
корміць людзей-шчанятаў
якіх пакінулі багі
забыўшыся
пра свае абавязкі

Мой каўчэг павольна садзіцца
на мель слоў і сноў

вакол сабраўшыся публіка
чакае белага голуба
феерверкі балёнікі
чакае з цікавасцю
ацалелых людзей
жывёлаў і дрэвы
кратоў і райскіх птушак

Толькі з каўчэга ніхто
не выходзіць

П’яны дойлід
спіць сярод голых целаў
якія смярдзяць і гніюць
Мяне завуць Канагава

мяне завуць Цунамі
смяецца маладая дзяўчына
паказвае тату
на попцы на жываце
пранырлівыя камеры вандруюць
па лабку
ў багавінні й перлінах
праслізгваюць па плоцевых
губах па вуснах
у ракавінках і пяску

мярцвячына смярдзіць
наканаванне з бяльмом
на воку за намі сочыць
каляровыя мяшкі з тушамі
тапельцаў раскіданыя абы-як
ці складзеныя ў кантэйнеры
лядоўні ў брацкія магілы
ў ямы рэфрыжэратары
яшчэ не спалі воды а
на пляжах з’явіліся турысты
прыгожыя маладыя дзяўчаты
ў кашульках з надпісамі
я хачу Вялікае Цунамі
ці не жадаеш Шторму
разам са мной

прадаюцца гаджэты
дробязі і цацкі
фота гнілых целаў
мярцвячыны звяроў людзей
прадаюцца дзеці
купляюцца дзеці
для бардэляў

Цунамі цікавая медыйная
нагода на паверхні
бясконцасці

Пранырлівыя камеры корпаюцца ў трупах
аб’ектывы даследуюць бездапаможныя мёртвыя целы
журналісты і фотарэпарцёры
ўздымаюць у кіпцюрах
фрагменты шматкі кавалкі
людскога мяса гадзіннікі
галовы рукі пярсцёнкі далоні
завушніцы вантробы нататнікі тэлефоны
павольна «ўсё»
вяртаецца ў норму
Турысты на адмаўляюцца
ад купленых імі пуцёвак

гэта глядзіцца вось гэта адрэналін
«рэйтынгі» б’юць рэкорды
я пішу на вадзе
я пішу на пяску
са жмені ацалелых слоў
з некалькіх сказаў простых
як проза цеслі
з некалькіх голых вершаў
я будую каўчэг
каб хоць што ўратаваць
ад патопу
які нас заспявае знянацку
сярод белага дня
ці апоўначы
і змывае з паверхні зямлі

я будую мой каўчэг
мой п’яны карабель
папяровае судна
пад чырвонымі
чорнымі ветразямі

І што з таго што ў сне

*Вроцлаў 2004 – 2005*

# З КНІГІ «КУПІ КАТА Ў МЯШКУ»
# 2008

## Credo

*Das Wahre ist das Wirkliche (...) Das falsche Gold ist nicht wirklich das, als was es erscheint. Es ist nur ein "Schein" und deshalb unwirklich. Das Unwirkliche gilt als Gegenteil des Wirklichen. Aber Scheingold ist doch etwas Wirkliches. Demgegen sagen wir deutlicher: das wirkliche Gold ist das echte Gold. "Wirklich" ist aber doch beides, das Gold nicht minder als das umlaufende unechte. [unw.]*

Martin Heidegger, Vom Wesen der Wahrheit

### I. Наступае

наступае вялікі
Спонсар Мецэнат
у масцы ў каптуры
ў цыліндры на галаве
дзіцятка беражыся бо камінар
цябе захопіць Князь гэтага свету
хросны бацька

наступае дабрадзей
кідае ў шапкі берэты
кацялкі і барэты
«Узнагароды»

вялікую малую ці іншую
абы толькі прэстыжную
аб'едкі з барскага стала
долю працэнта
гару папяровых грошай
гару папераў цэнных
без цаны
грош (але не ўдовін)
для лаўрэата Нобелеўскай прэміі
міру

а міру як не было так і няма
й не будзе
si vis pacem, para bellum

грош для раманіста
грош для паэта пакутніка
блазна які спявае
ў пякельнай печы цэнзуры
тры грошы ад багіні перамогі
ад петраркі ад гердэра
ад гётэ і бюхнера
для дварняка і Гамера
тры оскары для Кінг-Конга
мільярд для гары потэра

мы сядзім на парнасе
паказваем
струпы куксы раны шнары
(вось за радзіму а вось ад радзімы)
прысядаем ля святыняў і банкаў
ля могілкавай брамы
ля крэматорыяў ля сценаў смерці
сядзім у мундзірах шлемах
у набрынялым крывёю дапатопным рыззі
ў робах і фраках
тэатральных касцюмах

Вытворцы прамянёвай смерці
смерці хімічнай і біялагічнай
вытворцы страху
Спонсары высокай культуры
з ніжняй паліцы
кідаюць у цыліндр
ці даюць «на лапу» (давай сюды лапу)
«любімцам багоў» што яны
не хочуць паміраць маладымі
творцам культуры і навукі
пакутнікам мастацтва
насоўваюць на голаў лаўры

сунуць узнагароды miss’кам
матронам паненкам статысткам
бардэль-мамам і курваналіям
як казаў Віткацы
сунуць за рызінкі ад майткаў
у лагчынку паміж цыцак
у зубы паміж вуснаў
узнагароды ўзнагароды ўзнагароды оскары экраны
і просты чалавек разявіць рот
ў Нью-Ёрку аб’явілі
дзень Кінг-Конга
дзень паэзіі дзень дамаганняў
з нас высмакталі душу розум
цяпер увесь год круглы год
у нас у сіле карнавальны строй

## II. Залатая цагліна

людзі! людзі!

хто мае вушы каб чуць
няхай чуе
ні нафтай ні бензінам
не нап’яцеся

ні з грошай папяровых
ані з папераў «цэнных»
не зробіце мукі ці хлеба

Цырульнік Каламіс
выкопваў яміну ў зямлі
й даверыў свету таямніцу
«Цар Мідас мае асліныя вушы»
на гэтым месцы вырасла трысцё
і сваім шолахам разнесла навіну
па цэлым свеце

хто мае вушы каб чуць
няхай чуе шолах трысця
трысця якое думае
Чалавека

Алан Мідас Грынс Пан Вулф і Віц
Пан Барэль Нафты і Гары Потэр
кіруюць планетай
Залаты Цялец заспакойвае смагу
чорным золатам
Алан піша ў ванне бэстсэлер
прадказвае Чорны Чацвер
1929 года калі распачаўся
Вялікі Крызіс
парытэт парытэт
парытэт паміж
валютамі праміне
але гэта 19 кастрычніка 1987
Чорны Панядзелак
а я нічога пра гэта не ведаў

я бачу на маленькай карцінцы ў ТБ
залатую цагліну гэта рэцэсія
ад рэцэсіі толькі золата
Пан Барэль і Пангрынспан
і Гары Потэр яшчэ кіруюць
нашым светам
але іх свет ідзе да канца
Залаты Цялец пачынае хварэць
на шаленства
нафта за 100 зялёных за барэль
цяпер золата па 900
за унцыю купі пане цагліну (Золата!)
Тадку! колькі важыць унцыя золата?
не ведаю даруйце
тады нічога з цябе ўжо не вырасце
28 грамаў! зараз жа куплю пярсцёнкі
мы жанатыя 58 год

ніколі не позна дурненькі
пане купі пане купі
Залатую Цагліну
кажа голас з-пад цёмнай зоркі

але на залатой цагліне
– я адказваю –
не вырасце колас пшаніцы
бульбіна ці пятрушка
зернетка рысу
золатам не падсілкуецца
ні чалавек ні карова
ні леў ні асёл
ні цар ні жабрак

паспрабуй адкусіць кавалак
золата дурань Мідас!

Тадку нічога з цябе не вырасце
чую я голас з куста бэзу
скажы мне хлопча
што такое ФРС
не ведаю
а што такое Ўол-стрыт
ці што такое Доў
не ведаю але Ўол-стрыт
гэта вуліца ў Амерыцы!
а хто адкрыў Амерыку
гэта не я прафесар

## III. Пошукі золата хараства і ісціны

найвялікшая ісціна XXI стагоддзя
і найвялікшая таямніца гэта ТОЕ
што няма ісціны
сапраўдны свет
быў украдзены ў людзей

і ў багоў
на гэта месца Князь гэтага свету
падсунуў апошнім людзям
свет фальшывы
які сыходзіць золатам крывёю нафтай

у гэтым свеце
я стаў шукальнікам паэзіі

я верыў
што я шукальнік ісціны
і хараства

«аднойчы была вайна»
пасля той вайны дзе і я
панюхаў пораху
пісаў Стэйнбек
«простыя людзі навучыліся многаму
за апошнія 25 год і ўжо нельга
іх ашукаць старымі магічнымі словамі.
Не верац у залатую будучыню,
якая складаецца са слоў».

рана (зарана?) я зразумеў
тое чаго не хацелі зразумець
паэты і святары

шукальнік ісціны ніколі
не быў шукальнікам «ісціны»
быў шукальнікам «хараства»
а хараство і ісціна ўтвараюць
неадпаведную пару
бо «ісціна» можа быць
брыдкай агіднай скалечанай
пекла Дантэ
не мае нічога агульнага з ісцінай
але жахліва прыгожае пекнае
геніяльныя вершы і паэмы

гэта звычайныя наборы
слоў і сказаў
граматыка паэзіі
гэта граматыка маўчання недахопу
хараство нараджаецца
з неабсяжнага лона прыроды праціскаецца
цераз губы малыя й вялікія

скрываўленая сляпая паэзія
пачынае казаць

я шукальнік паэзіі
з года 1928

схіліўшыся над мутнай
соннай поўнай адкідаў
ракой жыцця
я спрабую

зачэрпваю з мора мовы
сто разоў пераліваю
з пустога ў парожняе
прасейваю пясок слоў
стаміўшыся засынаю
тады бог ракі
чысты халодны прывабны
ўцякае
прачынаюся з камком
гразі ў сціснутай далоні

у сонечным ззянні
пры святле месяца бачу
золата
золата золата золата

гуана распыленае ў космасе
ў «бясконцасці»

я пачынаю спачатку
пачынаю яшчэ раз
пачынаю з канца

*2007 – 2008*

## Змест

АЦАЛЕЛЫ: ТАДЭВУШ РУЖЭВІЧ .......... 5

З КНІГІ «НЕСПАКОЙ»

Маска .......... 7
Крошка .......... 8
Плач .......... 9
Маці павешаных .......... 11
Доля .......... 12
Два прысуды .......... 13
Да мёртвага .......... 14
Ацалелы .......... 15
Называю маўчаннем .......... 16
1939 год .......... 17
Гнаны .......... 18
Вучань чарнакніжніка .......... 19
Жывыя паміралі .......... 20
З дому майго .......... 22
Развітанне .......... 23
Дасканалая .......... 24
З нататак .......... 25
Яблык .......... 26
Калі ты сыходзіш .......... 27
Жывая зорка .......... 28

З КНІГІ «ЧЫРВОНАЯ РУКАВІЧКА»

Бачу вар’ятаў .......... 29
Адведзіны .......... 30
Каштан .......... 31
Чужаніца .......... 32
Вяртанне .......... 33
Курган .......... 34
Фенікс .......... 35
Дрэва з жалю .......... 36
Пакінутае гняздо .......... 37
Быў .......... 38

Яткі ........ 39
Неба дзяцінства ........ 40
Калі хто пабачыць ........ 41
Ад маіх ног ........ 42
Крыўда ........ 43
Як добра ........ 44

З КНІГІ «УСМЕШКІ»
Цяпло ........ 45
Колер вачэй і пытанні ........ 46
Шнур ........ 47
Хлопчык у чырвонай канфедэратцы ........ 48

З КНІГІ «ПЯЦЬ ПАЭМ»
Прызнанне ........ 49
Крылы і рукі ........ 50
Вежа са слановай косці ........ 51
Адказ ........ 52

З КНІГІ «ЧАС, ЯКІ МІНАЕ»
Сачу вачыма ........ 54
Не смею ........ 55

З КНІГІ «ВЕРШЫ І КАРЦІНЫ»
Паэтыка ........ 56
Вобраз ........ 58
Успамін дзяцінства ........ 61
Сведка ........ 62
Мяшчанская смерць ........ 63

З КНІГІ «СРЭБНЫ КОЛАС»
Спальванне вершаў ........ 64
Спрабуе ........ 65
Каханне 1944 ........ 66
Мастачка ў Стары-Сончы ........ 67
Удалося ........ 68
Готыка 1954 ........ 69

З КНІГІ «ПАЭМА ШЧЫРАСЦІ»
Паэма шчырасці ........ 70
Лук ........ 70
Бяздумна спяшаючыся ........ 71
Успамін першы ........ 72
Мур ........ 73
Успамін другі ........ 74

Што было схавана ........ 75
Людзі людзі ........ 76
Развязаныя рукі ........ 77
Голас ........ 78
Гэта не можа скласціся ........ 79
Чакаю ........ 81
Дурны жарт ........ 82
Можа гэта быў не дом ........ 83
Седзячы за сталом ........ 84
*** Мы рухаемся… ........ 85
Заслоны ........ 86
Хутчэй ........ 89
Чараўніца ........ 91
Шпора ........ 93
Я крычаў уночы ........ 94
Дрэва ........ 95
Крышталёвае нутро бруднага чалавека ........ 96
Пакіньце нас ........ 101
Таямнічае слова ........ 102
У цэнтры жыцця ........ 105
Пасмяротная рэабілітацыя ........ 107

З КНІГІ «ФОРМЫ»
Формы ........ 109
Не маю адвагі ........ 110
Ёў 1957 ........ 111
Разладжаны ........ 112
Дзверы ........ 113
Ліст да людажэрцаў ........ 114
Сустрэча ........ 115
Кампазіцыя ў трох абліччах ........ 116

З КНІГІ «РАЗМОВА З ПРЫНЦАМ»
*** Хто звязаў мне рукі… ........ 117
Размова з прынцам ........ 118
Выйсце ........ 122
Кара ........ 123
Новы чалавек ........ 124
Страх ........ 125
Зычлівасць ........ 126
Помнікі ........ 127
Дапаўненне ........ 128
Смерць ........ 129

Невядомы ліст .......... 130
Новыя параўнанні .......... 131
Тры профілі паэта .......... 132
Анёлак яшчэ не скончаны .......... 134

З КНІГІ «ЗЯЛЁНАЯ РУЖА»
Змаганне з анёлам .......... 135
У дзённым святле .......... 137
*** Кідалі зямлю на труну… .......... 139
Блазан .......... 140
Домік .......... 141
Зняцце цяжару .......... 142
Я пісаў .......... 143

З КНІГІ «НІШТО Ў ПЛАШЧЫ ПРАСПЭРА»
Пра дакладныя прыкметы (так званай) паэзіі .......... 144
Кармленне Пегаса .......... 146
Нішто ў плашчы Праспэра .......... 147
Усмешка .......... 148

З КНІГІ «ТРЭЦІ ТВАР»
З жыццяпісу .......... 149
Смех .......... 150
*** Асізі гняздо… .......... 151
Талент .......... 152
Першае схавана .......... 153
Лазанскія вершы .......... 154
Прасвятленні .......... 155
Каменяломня .......... 156
Будую .......... 157
Нішто .......... 158
Пранікненне .......... 159
Накід сучаснага мілоснага верша .......... 160
Адчыняліся дзверы .......... 162
З нейкага часу .......... 163
Сярод мноства спраў .......... 164
Капітуляцыя .......... 165
Карэктура .......... 166
У тэатры ценю .......... 167
Новы верш .......... 168
Апавяданне пра старых жанчын .......... 169
Кароткі змест .......... 172
Веды .......... 174
Мая паэзія .......... 175

З КНІГІ REGIO, 1969
Успамін сну з 1963 года ........ 176
Хатнія практыкаванні на тэму анёлаў ........ 178
Цёрн ........ 180
Той самы твар ........ 182
Канец ........ 183
*** Сёння я бачыў Равэну ........ 184
Па дажджы ........ 185
Сумка ........ 186
*** Яшчэ ў сне ........ 187
Альфа ........ 188
Перавыхаванне ........ 189
*** Рэчаіснасць… ........ 190

З КНІГІ «БЕЗ НАЗВЫ»
Без назвы ........ 191
***Аблічча айчыны… ........ 193
Пахаваны ў смеху ........ 194
Я бачыў дзівоснага монстра ........ 195
З КНІГІ «ТРАЎМАТЫЧНЫЯ АПАВЯДАННІ» ........ 198
*** Я прадзіраўся праз гэты сон… ........ 198
Перасыпанне ........ 199
Сыходзячы ........ 200
*** Я сядзеў у фатэлі ........ 201
Абраз ........ 202
Дзве мовы ........ 203
Ладдзя ........ 204
Так склалася ........ 205
Сон ........ 207
Траўматычнае апавяданне ........ 208

З КНІГІ «НА ПАВЕРХНІ ПАЭМЫ І ЎНУТРЫ»
*** Я спрабаваў успомніць ........ 210
Паэт падчас тварэння ........ 211
*** Я схаваў твар у далонях ........ 213
На ссячэнне дрэва ........ 216
*** Бясколерны... ........ 219
Вобраз нутра ........ 220
Верш ........ 221
Святло цень ........ 223

З КНІГІ «БАРЭЛЬЕФ»
Без ........ 224
*** Паэзія не заўжды… ........ 226

*** На пачатку........................................................................ 227
*** Мой час наступае ................................................................ 228
Крэйдавае кола...................................................................... 229
Дэзерціры ............................................................................. 231

З КНІГІ «ЗАЎСЁДЫ ФРАГМЕНТ»
Звеставанне.......................................................................... 235
Нявыказанае.......................................................................... 237
*** Пусты пакой… .................................................................. 238
Хатняе заданне...................................................................... 239
*** Чаму паэты п’юць гарэлку…............................................. 240
*** Віхор грукаўся ў вокны… ................................................ 241
Чаго было б шкада................................................................. 243

З КНІГІ «ШЭРАЯ ЗОНА»
Павуціна ............................................................................... 244
*** На дарозе… ..................................................................... 246
*** Мінулае зноў пачынаецца................................................. 248

З КНІГІ «Выйсце»
Залатыя думкі на чорным фоне............................................. 250
Палец на вуснах..................................................................... 252
Апошняя размова................................................................... 253

З КНІГІ «І што з таго што ў сне»
І што з таго што ў сне............................................................. 254

З КНІГІ «КУПІ КАТА Ў МЯШКУ»
Credo .................................................................................... 258

**Ружэвіч**, Т.
Р83 Без : выбраныя вершы / Тадэвуш Ружэвіч; пер. з польск. мовы Марыны Казлоўскай. — Мінск : Зміцер Колас, 2012.— 272 с.
ISBN 978-985-6992-20-2

Выданне ўяўляе сабой збор выбранных твораў вядомага сучаснага польскага паэта Тадэвуша Ружэвіча, якія даюць магчымасць пазнаёміцца з вершамі розных перыядаў творчасці аўтара.
Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

УДК 821.161.1-1
ББК 84(4Пол)-5

Літаратурна-мастацкае выданне

**Ружэвіч** Тадэвуш

**БЕЗ**

Выбраныя вершы

Адказны за выпуск Зміцер Колас

Падпісана да друку 1.08.2012. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк рызаграфічны.
Ум. друк. арк. 14,28. Ул.-выд. арк. 8,73.
Наклад 500 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас
ЛИ № 02330/0552654 ад 14.01.2010.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.

Пераплёт выраблены
ў ТАА «Інпрэдо»
Вул. Сямашка, 15-29/1, 220116, Мінск